Пралетарыі ўсіх краёў, аднаўцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
14 сьнежня 1931 г.
№ 287 (3376)

ДЕРЖИВ. ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА

Дэкадн к Камакадэміі

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

на ўкараненьне марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі

Пралетарская непарыўная сувязь Беларускай Акадэміі Навук з Камакадэміяй СССРмацнее і разьвіваецца

Задача навуковых працаўнікоў-марксыцка--ленінскае выхаваньне новых кадраў

(З прамовы прадстаўніка прэзыдыуму Камакадэміі)

Прадстаўнік ад прэзыдыуму Камакадэміі т. Пашуканіс вітаючы марксыстаў-ленінцаў навуковага фронту Беларусі, у сваім дакладзе спыніўся на важнейшых задачах барацьбы за марксысцка-ленінскую тэорыю. У сучасны момант,—кажа т. Пашуканіс,—мы перажываем такі размах сацыялістычнага будаўніцтва, які ставіць перад тэорыяй цэлы рад новых праблем, якіх да гэтага часу ня ведала навуковая думка. Праблема разьмеркаваньня вытворчых сіл краіны, індустрыялізацыя, стварэньне буйнейшай у сьвеце аграмаднаяй сельскай гаспадаркі, ставіць праблему новых насельных пунктаў, новых гарадоў. Мы павінны пакіраваць усе нашы сілы на тое, каб вывучыць гэтыя працэсы, бо гэта мае вялізарнае палітычнае значэньне.

Калі пралетарыят ірвецца да навукі, дык буржуазія наварочваецца сьпі ной да яе, кідаецца ў абоймы містыкі. Перад навуковымі работнікамі марксыстамі-ленінцамі стаіць задача марксысцка-ленінскага выхаваньня новых кадраў. У барацьбе за бальшавізацыю навукі, асабліва важная задача выпадае на тт., якія працуюць у галіне гісторыі, бо выхаваць марксыста-ленінца магчыма толькі расказаўшы яму аб клясавай барацьбе пралетарыяту, як расла і складалася партыя бальшавікоў. Прамова т. Сталіна на канфэрэнцыі аграрнікаў марксыстаў паставіла ва ўсю велічэ патрабаваньні, якія вымагаюцца пераходам да разгорнутага сацыялістычнага наступу. Нам трэба ліквідаваць адставаньне працы нашых навуковых установаў ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва. Прамова т. Сталіна паслужыла пачаткам для разгортваньня шырокай самакрытыкі ў радах марксыстаў-ленінцаў, у перабудове тэарытычнай работы ў бок увязкі з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, з палітыкай.

Нам давялося сустрэцца з установамі, што Ленін і Сталін і іх працы—рэвалюцыйная практыка, а тэорыя—гэта працы Маркса. Ігнараваньне тэарытычных прац т. Леніна і Сталіна выразна акрэсьлівалася ў працах меншавіка—Разанава і Дэборына. Каб пайсьці ўперад неабходна было разьбіць меншавіцкую рэтаўрацыю Гегеля, адмаць ігнараваньне тэарытычнай спадчыны Леніна. Мы стаім зараз перад задачай праводзіць навукова-дасьледчую працу на аснове рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, разгарнуць калектыўны — брыгадны мэтад працы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, зьнішчыць абязьлічку і ўраўнілаўку. Гэта шчыльна ўвязваецца з барацьбой за партыйнасьць навукі, у гэтай працы для нас мае вялікае значэньне ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская Революция».

Ня толькі ў галіне тэорыі, але і ў галіне гісторыі дзяржавы патрэбна жорсткая барацьба супроць прапягваньня поглядаў, якія льюць ваду на млын ідэй пераўзбраеньня.

Адпор патрэбен таксама і па лініі нацыянальнага пытаньня. Нельга весьці дыскусію аб тым, правільна ці няправільна зрабілі бальшавікі абараняючы лёзунг самавызначэньня народаў аж да аддзяленьня, як лёзунг няпрымірымай барацьбы супроць вялікадзяржаўнага шавінізму. Ва ўсіх галінах мы—навуковыя працаўнікі Савецкага Саюзу павінны памятаць, што на нас кладзецца абавязак дапамогі нашым брацкім кампартыям, нам трэба шчыльна згуртаваць свае рады для барацьбы за выразнае правядзень не гэнэральнай лініі партыі, за ўвязку навуковай працы з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна, ЦК і правадыра тав. Сталіна на франтох навуковай працы мы ў бліжэйшы час забясьпечым такія-ж рашаючыя перамогі, якія мае рабочая кляса на фронце гаспадарчага будаўніцтва.

(БелТА).

Мала аўладаць сумай ведаў,—трэба аўладаць ёю па бальшавіцку

(З прамовы прэзыдэнта БАН тав. ГОРЫНА).

У сваім выступленьні тав. Горын спыніўся на важнейшых момантах барацьбы за бальшавіцкую навуку ва ўмовах Беларусі і задачах дэкадніка. Тав. Горын падкрэсьліў што дэкада павінна зьявіцца пачаткам цеснай сувязі навуковых установ Беларусі з Камуністычнай Акадэміяй, як цэнтрам марксысцкай навукі СССР.

Наша навука,—кажа тав. Горын,—вырашае праблемы, якія нават ня можа і паставіць буржуазная навука. Але нам мала аўладаць сумай ведаў і дасягненьняў навукі капіталістычнага грамадзтва, нам трэба ўмець аўладаць ёю па бальшавіцку каб найлепш скарыстаць для патрэб сацыялістычнага будаўніцтва. Наша навука зможа цалкам задавальняць патрэбам сацыялістычнага будаўніцтва, толькі пры ўмове рашучай барацьбы за марксысцка-ленінскую мэтадалёгію, даючы руйнуючы адпор клясаваму ворагу. Ліст тав. Сталіна, хоць і адрасаваны гісторыкам, у сапраўднасьці мае вялікае значэньне для навуковых работнікаў як грамадазнаўчых, так і прыродазнаўчых навук. У нашых умовах, калі клясавы вораг ня чураецца ніякіх прыёмаў клясавай барацьбы і кантрабандай працягвае нам варожыя погляды, мы на ўсіх навуковых франтох павінны быць асабліва пільнымі і не дапушчаць гнілога лібэралізму.

Далей тав. Горын ставіць пытаньне аб асноўных задачах, якія стаяць перад навуковай думкай БССР і ў чым асабліва патрэбна дапамога Камуністычнай Акадэміі. Мы чакаем дапамогі ад Камуністычнай Акадэміі,—кажа тав. Горын—у нашай барацьбе за партыйнасьць навукі, за ўкараненьне марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ва ўсіх галінах навукі, дапамогі ў барацьбе за якасьць навуковай прадукцыі.

У барацьбе за якасьць навуковай прадукцыі і за падняцьце навуковай кваліфікацыі мы павінны ісьці сьледам за нашымі настаўнікамі Марксам, Энгельсам, Леніным, работы якіх былі вынікам глыбокага вывучэньня вялікага канкрэтнага матар'ялу. Шмат хто з навуковых працаўнікоў, асабліва грамадаведы, недаацэньваюць вывучэньня прыродазнаўчых навук. У перажываемы намі рэканструкцыйны пэрыяд, неабходна, каб навуковыя працаўнікі, якія працуюць у галіне грамадазнаўчых навук, рашуча павярнуліся да пытаньняў прыродазнаўчых навук, бо гэта дапаможа нам на аснове марксызму выкоўваць і далей нашу рэвалюцыйную тэорыю. Я думаю,—кажа тав. Горын,—што Камуністычная Акадэмія павінна разгарнуць вялізарную кампанію за неабходнасьць павароту нашых грамадаведаў да прыродазнаўчых навук.

Далей тав. Горын падкрэсьлівае неабходнасьць дапамогі з боку Камакадэміі па вызначэньні тэматыкі нашай навуковай работы. У галіне навуковадасьледчай працы мы павінны выходзіць з неабходнасьці высоўваць на першы плян распрацоўку канкрэтных вузлавых праблем, зьвязаных з бягучымі задачамі партыі і пралетарыяту. Гэта важна асабліва таму, што СССР сваім пераможным сацыялістычным будаўніцтвам вырашае лёс сусьветнай рэвалюцыі.

Спыняючыся на барацьбе за бальшавіцкую тэорыю тав. Горын настойліва падкрэсьліў вялізарнейшае значэньне барацьбы з замкнутым акадэмізмам, паўзучым эмпірызмам, хвасьцізмам і рознымі апартунізмамі ў навуковай рабоце.

Згуртаваньне нашых навуковых работнікаў усяго Саюзу можа быць праведена на аснове ажыцьцяўленьня Ленінскай нацыянальнай палітыкі ў бязьлітаснай барацьбе з вялікадзяржаўніцтвам як галоўнай небясьпекай на даным этапе і з контрэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі. Камуністычная Акадэмія, зьяўляючыся цэнтрам марксысцкай навукі, адначасова павінна быць прыкладам бальшавіцкага вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў рэканструкцыйны пэрыяд.

Бязьлітасная барацьба з апартунізмам, яго кантрабандыстамі і бальшавіцкае ажыцьцяўленьне Ленінскай нацыянальнай палітыкі забясьпечыць нам сапраўднае брацкае адзінства марксысцкіх навуковых працаўнікоў усяго Саюзу і дасьць магчымасьць нашай навуцы атрымаць посьпехі яшчэ нябачаныя ў гісторыі.

Прэч рукі крывавых катаў ад барацьбітоў за сусьветны Кастрычнік

З рэзалюцыі рабочых друкарні імя Сталіна

Капіталістычны сьвет задыхаецца ў пятлі ўсё нагнабляючагося эканамічнага крызісу. Штодня там лопаюцца буйнейшыя банкі, зачыняюцца фабрыкі і заводы. Штодня на вуліцу, на галодную сьмерць выкідаюцца новыя і новыя дзесяткі і сотні тысяч рабочых.

Толькі адна ваенная прамысловасьць ня ведае крызісу, працуе поўным ходам. Імпэрыялісты рыхтуюцца да ўзброенага нападу на СССР.

Фашысцкая Польшча імкнецца крывавым тэрорам устрымаць узрастаючую рэвалюцыйную хвалю.

Уся Польшча, Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна пакрылася лесам шыбеніц. Ваенна-палявыя суды масава зьвяшчаюць рэвалюцыянэраў.

Гэтымі судамі і шыбеніцамі разьюшаны польскі фашызм імкнецца задушыць барацьбу рабочых і сялян і прынечаных народаў, на чале якой стаіць камуністычная партыя Польшчы.

У апошнія дні на шыбеніцах загінула шмат лепшых рэвалюцыйных барацьбітоў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны: у Баранавічах 7 рабочых чыгуначнікаў, у Горадні—2, у Самборы (Зах. Украіна)—2, у Кракаве—1 і г. д.

Падрыхтаваны ўжо новыя шыбеніцы для многіх іншых таварышоў.

Схіляючы галавы перад сьвежымі магіламі загінуўшых на фашыстаўскіх шыбеніцах барацьбітаў рэвалюцыі, мы, рабочыя-друкары друкарні імя Сталіна, у адказ крывавым фашыстаўскім катам і інтэрвэнтам абавязваем ся:

1. Разгарнуць работу па мабілізацыі сродкаў на дапамогу замежным рэвалюцыянэрам.

2. З посьпехам закончыць кампанію зімовай дапамогі.

3. Ліквідаваць усю запазычанасьць па членскіх узносах МОПР'у.

4. Усе, як адзін, уступіць у рады МОПР'у.

5. На бліжэйшым падрыхтавацца да сустрэчы апошняга году пяцігодкі.

Няхай жыве адзіны фронт працоўных усяго сьвету ў абарону СССР ад нападу імпэрыялістаў!

Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба рабочых і сялян у Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне пад кіраўніцтвам кампартыі Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Няхай жыве МОПР—дапаможнік рэвалюцыйным барацьбітом у іх рэвалюцыйнай барацьбе з фашызмам і белым тэрорам!

Вышэй сьцяг пралетарскай салідарнасьці

Рабочыя чыгуначнікі Менску заслухаўшы інфармацыю аб апошніх падзеях у Кітаі, Польшчы і інш. капіталістычных краінах выносяць рашучы пратэст супроць забойстваў і зьверскіх катаваньняў рэвалюцыйных вязьняў, супроць шалёнага тэрору сусьветнай буржуазіі.

У адказ на гэта рабочыя, чыгуначнікі Менску высоўваюць наступныя пункты:

1) 100 процантны ахоп рабочых асазьвіяхімаўскай работай;

2) усім як адзін уступіць у рады МОПР'у;

3) дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня транфінпляну.

Заяраем, што заўсёды гатовы стаць у рады Чырвонай арміі ідучы рука аб руку з пралетарыятам усяго сьвету.

***

Мы вучні 7-й класы 31 школы ў Менску, катэгарычна пратэстуем супроць зьверстваў нікусудчыкаў над рэвалюцыянэрамі Польшчы.

Польскі фашызм усімі сіламі зьверскага тэрору стараецца адцягнуць час сваёй пагібелі.

Але гэта ня ўдасца.

Бярэм на сябе рад абавязацельстваў па аказаньні дапамогі рэвалюцыянэрам, якія в гонарам выкананем.

Няхай жыве кампартыя Польшчы!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

Тысячная заява нанкінскага ўраду ў Лігу нацый

ПАРЫЖ. 7-XII Як паведамляе агенцтва Гавас, кітайскі дэлегат Шы Ючуй савету Лігі Нацый заяву нанкінскаму ўраду.

У гэтай заяве гаворыцца, што генерал Ма зьвярнуўся да нанкінскага ўраду з просьбай афіцыйна абвергнуць весткі аб тым, што ён мае намер атакаваць Цыцыкар.

Праграма Гітлера прыдушэньне рэвалюцыйнага руху і ўступленьне Нямеччыны ў акты-савецкі блёк

БЭРЛІН. 11-XII. У гутарцы з чэхаславацкімі дэпутатамі парляманту Крэбсам і Касьперам, Гітлер разьвіў падрабязную праграму вонкавай палітыкі нацыянал-сацыялістаў у выпадку прыходу іх да ўлады.

У сваёй заяве Гітлер асабліва падкрэсьліў «антыбальшавіцкую міжнародную місію» нацыянал-сацыялістаў. Гітлер лічыць, што «сьмешна меркаваць нібы нацыянал-сацыялісты хочуць вырашыць рэпарацыйную праблему ваенным шляхам». Паводле яго слоў, задачай нацыянал-сацыялістаў у сучасны момант зьяўляецца падрыхтоўка міжнароднай палітычнай глебы для ўласнай палітыкі нацыянал-сацыялістаў,—«калі насьпее час для канчатковай барацьбы супроць унутраных ворагаў—марксызму і бальшавізму». Далей Гітлер заявіў, што Нямеччына, якая ўладае імунітэтам супроць бальшавіцкай небясьпекі, займе магутнае месца ў міжнароднай палітыцы. Гэтая толькі адновіць давер'е да жыцьцё-здольнасьці нямецкай гаспадаркі, але і ў палітычных адносінах Нямеччына стане фактарам і дружба з ёй будзе мець прыцягальную сілу і цану для іншых».

Нацыянал-сацыялісты, паводле слоў Гітлера, не прасьледуюць ніякіх вызначных мэтаў ні ў адносінах Францыі ні ў адносінах яе паўднёва-ўсходніх васалаў... «Вайна паміж эўрапэйскімі дзяржавамі роўнасільна адкрыцьцю дзьвярэй бальшавізму. Першым гарматным стрэлам бальшавіцкая рэвалюцыя пашле свае першыя візытныя карткі эўрапэйскім сталіцам і дзяржавам. Перамога нацыянал-сацыялістаў у Нямеччыне азначае новы парадак ва ўнутранай і новы паварот у вонкавай палітыцы».

Цэнтралізацыя японскай улады ў Манчжурыі

ТОКІЕ. 12-XII. Паводле паведамленьня Сімбун Рэнга з Мукдэну, асноўныя японскія органы манчжурскай адміністрацыі фактычна пераведзены з Дайрэна ў Мукдэн. Мукдэн пераўтвараецца канчаткова ў цэнтр эканамічнай дзейнасьці Японіі ў Манчжурыі.

Рэвалюцыйная хваля ў Кітаі ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй

ШАНХАЙ. Учора ў некаторых месцах кітайскай частві гораду, а таксама на чужаземных тэрыторыях адбылися рабочыя і студэнцкія дэманстрацыі. Паліцыя безадкладна разагнала дэманстрантаў і арыштавала некалькі чалавек.

Адбылася таксама дэманстрацыя перад муніцыпалітэтам у кітайскай частцы гораду, у часе якой прамоўцы патрабавалі нізрынуцьця ўлады. Паліцыя дубінкамі разагнала мітынг; некалькі сот рабочых, жанчын і мужчын сабраліся перад парожным будынкам камітэту Гаміндана, якое было зруйнавана некалькі дзён таму назад. Рабочыя ўзьнялі чырвоны сьцяг. Кітайскія паліцэйскія вырвалі сьцяг і арыштавалі двух дэманстрантаў, у тым ліку адну жанчыну работніцу.

У другім месцы салдаты адкрылі агонь на мітынгу, арганізаванаму кулі ў момант, калі сабраўшыяся спрабавалі разгвроіць салдат. Адзін куль забіты і некалькі паранена. У кітайскай частцы гораду абвешчана ваеннае становішча. Выхады на чужаземную частку гораду забарыкадаваны. Паліцыя канфіскавала ў розных частках гораду 10 камуністычных лістовак, заклікаючых да падтрыманьня СССР, і нізрынуцьця Гаміндану і да барацьбы з імпэрыялізмам.

Вываз золата з Японіі

ТОКІЕ, 12-XII. Паводле паведамленьня газэты «Ніцы-Ніцы» урад Вакацукі ўчора парашыў паслаць у ПАЗШ золата на 30 млн. іен для пакрыцьця зьдзелак па закупцы дахраў. Адсылка прызначана на 15 сьнежня. Такім чынам, залаты запас Японіі скароціцца на 490 млн. іен.

Няўдачны дэмарш польскай ваеншчыны

БЭРЛІН, 12-XII. Сёньня гаагскі трыбунал вынес рашэньне на карысьць Данцыга ў польска-данцыгскім канфлікце да пытаньні аб праве Польшчы на трыманьне сваіх ваенных суднаў у данцыгскім порце. Рашэньне было прынята большасьцю адзінаццаці галасоў супроць трох (Францыі, Польшчы і Калумбіі). У рашэньні ўжо зазначаецца на тое, што данцыгскі порт не належыць да тэрыторыі Польшчы і прэтэнзіі Польшчы могуць быць выкананы толькі пры парушэньні правоў Данцыга.

Нямецкі друк з вялікім задаваленьнем публікуе рашэньне гаагскага трыбунала, заўважаючы, што Польшча ў сваіх патрабаваньнях ня права на толькі юрыдычна, бо яна пабудавала ў Гдыні вялікі ваенны порт і можа там трымаць свае ваенныя судны, а не карыстацца для гэтага Данцыгам.

ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР

Чырвоныя партызаны і чырвонагвардзейцы Чэрвеньскага раёну сабраўшыся на свой зьлёт—шлюць свае прывітаньне ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР.

Абгаварыўшы на зьлёце вынікі аб'яднанага ліста-падаўскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б і горача вітаючы гэтыя рашэньні чырвоных партызаны і чырвонагвардзейцы абяцаюць прыкладаць усе свае сілы і ўсю энэргію на выкананьне гэтых рашэньняў і канкрэтна бяруць на сябе наступныя абавязкі па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў:

уключыцца ў конкурс нізавога друку абвешчаны газэтай «Правда»,

у гонар другой сэсіі ЦВК з 10 па 15 сьнежня абязшчаюць па раёне штурмавы пяцідзённік партызан і чырвонагвардзейцаў па ліквідацыі прарыву ў загатоўках збожжа і лёну і па мабілізацыі сродкаў,

дзеля выкананьня гэтых задач арганізуюць па сельсаветах ударныя брыгады.

Чырвоныя партызаны і чырвонагвардзейцы Чэрвеньшчыны вынілікаюць на сацспаборніцтва па гэтых пытаньнях чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан Бярэзінскага раёну.

Гэта будзе моцным ударам па галаве кулака і яго агентаў правых і «левых» апартуністых.

Няхай жыве ленінская камуністычная партыя і не правадыр тав. СТАЛІН.

Няхай жыве генэральная лінія камуністычнай партыі.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР.

Па даручэньні зьлёту-прэзыдыум: Авіла, Дзяркач, Баранчык, Жданок, Рай, Дабрагост.

Апартуністычнае кіраўніцтва, засьмечанасьць кулацкім элемэнтам--

прывялі калгасы Веткаўшчыны да глыбокіх прарываў

ВЕТКА. (Белта). Значная частка калгасаў Веткаўскага раёну засьмечаны варожымі кулацкімі і белагвардзейскімі элемэнтамі. У калгасах панае абязьлічка, у разьмеркаваньні ўраджаю мае месца кулацкая ўраўнілаўка.

Рад праўленьняў колгасаў падпалі пад кулацкі ўплыў. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі выходзяць з калгасаў. У калгасе «Гарадок» Н-Грашыкскага сельсавету, кулакі і былыя леса прамыслоўцы кіруюць праўленьнем—разбураюць калгас. Членамі гэтага калгасу зьяўляюцца кулак Грамыка І. А., які меў 100 га зямлі, 8 кароў, 4 коні, мае цьвёрдае заданьне; Вульбенка А. І. былы лесапрамыслоўца, меў 50 га зямлі, 9 кароў, здаваў у аренду дом, член праўленьня калгасу Грамыка В. І. і рахункавод Грамыка Ф.—былыя лесапрамыслоўцы і кулакі, мелі 50 га зямлі, 7 кароў, 3-х коняй. Гэтая група трымае ў заціску бедняту і камсамольцаў. У калгасе згніло 15 тон бульбы, з 80-ці абагуленых кароў частка загінула, а астатнія ледзь ходзяць (хворыя).

Кулацка-заможныя элемэнты пралезьлі ў калгас «Энэргія», зрываюць выняцьце статуту і абагуленьне мае масьці, зьнішчаюць абагуленую жывёлу, крадуць лес і прадаюць на прыватным рынку. У выніку 11 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак выйшлі з калгасу, калгас разбураецца. Сельсавет зусім мала цікавіцца працай калгасаў. Важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду па арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаваньні калгасаў не знайшлі патрэб нага пралыменьня ў працы сельсавету.

У калгасе «Прасьвет» маюцца таксама кулацка-заможныя элемэнты з цьвёрдымі заданьнямі. Праўленьне калгасу бязьдзейнічае, меры да ачыстки калгасу ня прымаюцца. У калгасе панае абязьлічка, ураўнілаўка, правалена будаўніцтва сьвінарніка.

Засьмечан кулацкім элемэнтам і калгас «Рэшчыльны». Уступленьню кулакоў і лішэнцаў у калгас дапамагаў Тарасаўскі сельсавет, які вызваляў іх ад цьвёрдых заданьняў і накіроўваў у калгасы. Зараз гэтыя кулакі разбураюць колгас, зрываюць абагуленьне маемасьці—коні, каровы і інвэнтар не абагулены і зараз. Інвэнтар знаходзіцца пад адкрытым небам, коні ўтрымліваюцца недапушчальна дрэнна, сілосная яма не пакрыта, бязнадзейнік будуецца чэрапашымі тэмпамі. Працадні запісваюцца праз месяц пасьля працы.

Калгас імя Молатава практыкуе буржуазна-кулацкую і рвацкую практыку. Старшыня праўленьня калгасу лічыць, што з пачатку трэба забясьпечыць прадуктамі сябе, а потым здаваць па пляну. Ня лепш абстаіць справа ў калгасе імя Максіма Горкага.

Раённыя арганізацыі да пытаньня ачысткі калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў адносяцца па апартуністычнаму. Новаму кіраўніцтву райкалгассаюза даецца слабая дапамога ў ачысткі калгасаў ад кулакоў. Да ачысткі калгасаў Веткаўскага раёну патрэбна прыняць самыя рашучыя меры.

Сваячасова апрацаваць і здаць лён--

—баявая задача кожнага калгасу, МТС, саўгасу—

У Баярскім і Бельскім сельсаветах, Полацкага раёну — апрацоўка і загатоўка тэхкультур яшчэ не разгорнута

Полаччына зрывае лёназагатоўкі

Полацак (Наш кар.) Газэта ня раз ужо сыгналізавала аб тым, што лёназагатоўкі праходзяць вельмі слаба па Полацкім раёне. Аднак, ня гледзячы на гэта раённыя арганізацыі ня ўжылі свалчасова захады, каб ліквідаваць прарывы і дабіцца выкананьня пляну лёназагатовак у вызначаны тэрмін. Да апошняга часу загатоўка лёну па цэлым радзе сельсаветаў і калгасаў яшчэ не разгарнулася, апрацоўка лёну не арганізавана, лёнамялкі не нагружаны, лёнатраста ляжыць на полі.

Пяцідзённік праверкі лёназагатовак па раёне ня даў ніякага эфэкту. У Кушлінаўскім і Замшанскім сельсаветах апрацоўка лёну зацягваецца. Брыгады хоць і арганізаваны, але яны працуюць нерэгулярна, лёнамялкі поўнасьцю не нагружаны.

У калгасе «Новы Быт», Баярскага сельсавету, апрацоўка лёну зусім спынена, лёнамялка стаіць без работы. Партыйная ячэйка апартуністычна адносіцца да лёназагатовак.

— Я і так нагружан, мяне, браткі, вяла грамадзкая работа, няма часу займацца апрацоўкай лёну,—заяўляе сакратар ячэйкі т. Цацэнка.

Ня лепш абстаіць справа з апрацоўкай лёну ў калгасе імя Фрунзе, Баярскага сельсавету, дзе для трапаньня лёну вылучан толькі адзін калгасьнік.

Таксама дрэнна праходзіць апрацоўка лёну і па Бельскім сельсавеце, дзе плян здачы лёнавалакна выкананы на 13 проц., лёнасемя на 55 проц.

Зусім дрэнна арганізавана апрацоўка канапель. У калгасе імя Варашылава намочаныя канапелі засталіся пад лёдам. У калгасе «Бальшавік», Дамінікоўскага сельсавету, выцерабленыя канопілі нават ня зьвезены з поля.

У тых калгасах, дзе вакол лёнаапрацовак разгорнута масавасьць, у гэтай справе дамагліся значных посьпехаў. Так, у калгасе «Гігант» амаль поўнасьцю закончана апрацоўка лёну і на 50 проц. выкананы плян лёназагатовак. У калгасе «Авангард» арганізаваны дзве начныя брыгады па мяцьцю лёну. Брыгада т. Грысьліса значна перавыконвае норму выпрацоўкі. Для трапаньня лёну таксама вылучана спэцыяльная брыгада, якая абавязваецца закончыць гэту работу ў самы кароткі тэрмін.

Спагнаньне тэхкультур па цьвёрдых заданьнях з кулацка-заможных гаспадарак разгортваецца вельмі марудна. У Бельскім, Замшанскім і Кушлікоўскім сельсаветах папкаюцца з кулаком, а ў Махіраўскім сельсавеце зусім не знайшлі кулакоў (?!).

Як. Зорны.

Аб дэкларацыйнасьці ды папяровым спаборніцтве

Лепель. Капчынскі сельсавет уключыўся у месячніх лёназагатовак, абвешчаны ЦК КП(б)Б. Сельсавет нават высунуў сустрэчны плян, згодна якога абавязваўся на працягу месячні ка загатовіць ня толькі 70, а ўсе 100 проц. пляну. Але на справе сельсавет нічога не рабіў. Да гэтага часу пастанова ЦК КП(б)Б ня была даведзена да калгасаў.

Калгас «Шлях Сацыялізму» яшчэ ня здаў ніводнага кілёграму лёнавалакна. У цэнтральным аддзяленьні калгасу ня скончаны абмалот лёну. Брыгады па апрацоўцы лёну ня складзены. У аддзяленьні калгасу «Новы гурэц» лён расьцягваюць калгасьнікі.

Цытранскае сельснажыўтаварыства не клапоціцца аб стварэньні прэм'яльнага фонду для прэм'яваньня лёназдатчыкаў і ўдарнікаў. Партыйная і камсамольская ячэйка стаяць у баку ад лёназагатовак. Райкалгассаюз таксама ня цікавіцца пастаноўкай апрацоўкі лёну ў калгасе «Шлях Сацыялізму» і яго аддзяленьнях.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністах, якія нелаацэньваюць лёназагатоўчай кампаніі. За «очковтирательство» і папіровае сацспаборніцтва неабходна прыцягнуць да адказнасьці Капчынскі сельсавет.

Дор.

Апартуністычныя адносіны да апрацоўкі тэхкультур зрываюць пляны лёназагатовак

Старыя-Дарогі. Апрацоўка і здача (продаж) дзяржаве лёнавалакна і канапель па Стара-Дароскім раёне праходзіць вельмі марудна. На 3-га сьнежня загатоўлена толькі 19,8 проц. Ня лепшая справа з загатоўкамі лёнасемя, плян якога выкананы на 43,1 проц.

Поўную бязьдзейнасьць у загатоўках лёнавалакна праявіў Пасецкі сельсавет, які выканаў плян толькі на 1,8 проц., Шчыткаўскі—8,4 проц., Дражненскі—10,3 проц., Языльскі—11 проц. Лепш справіўся з работай Стара-Дароскі сельсавет, які выканаў плян на 46,8 проц.

Марудныя тэмпы лёназагатовак тлумачацца тым, што партячэйкі і сельсаветы апартуністычна адносяцца да гэтай важнейшай кампаніі, не даецца рашучы адпор кулаку, які агітуе супроць лёназагатовак, не разьбіта кулацкая ўраўнілаўка па калгасах, дзе часта лён разьмяркоўваюць на спажывецкія патрэбы.

Так, праўленьне калгасу «Чырвоная гвардзія» разьмеркавала паміж калгасьнікамі 180 пукоў лёну, а дзяржаве не здала ніводнага кілё. Калгас «Камунар», Пасецкага сельсавету, яшчэ не пачынаў апрацоўку лёну, бо праўленьне апартуністычна разважае—«дзяржаве здаць пасьпеем»... Ня здаў ніводнага кілё дзяржаве (плян—740 кілё) і калгас «Камуна». Слаба праходзіць апрацоўка лёну ў калгасах «Новы селянін» і «Чырвоная горка». Зусім не пачынаў апрацоўку лёну калгас «Фронтавік», Крываносаўскага сельсавету. Старшыня праўленьня Розум, кажа: «добра, што хоць убралі з поля, а з апрацоўкай пасьпеем».

Кулацка-заможным гаспадаркам Крываносаўскі сельсавет ня даў цьвёрдых заданьняў па лёнавалакне і каноплях.

Не вядзецца вучот спагнаньня цьвёрдых заданьняў па лёне з кулацка-заможных гаспадарак раёну. Райспаб ня мае ўліку іх.

Трэба зрабіць рашучы пералом на фронце лёназагатовак на Стара-Дароскім раёне.

Цьвёрдыя заданьні павінны быць зараз-жа спагнаны.

П. Харытановіч.

Аб Пленуме Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР

Пленум Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР

склікаецца 13 сьнежня 1931 г.

а 12 гадз. дню ў памяшканьні ЦВК.

Парадак дня наступны:

1. Аб выкананьні дзяржбюджэту БССР за 1929-1930 г. і асобны кв ртал 1930 г.
2. Дзяржаўны бюджэт БССР на 1932 год.

На Пленум запрашаюцца, акрамя членаў Бюджэтнай Камісіі ЦВК, кіраўнікі наркаматаў і зацікаўленых цэнтральных установ БССР.

Адказны сэкратар Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР Б. ...АНСОЎСКІ

ПОУНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

адзначыць правядзеньне раённых партканфэрэнцый

Бязьлітасная барацьба з кулацкімі месьніцкімі тэндэнцыямі і іх канкрэтнымі посьбітамі, разгорнутая масавая работа—парука перамогі на загатоўчым фронце

У бліжэйшыя дні выканаць плян збожжазагатовак

Ліста падаўскі пленум ЦК КП(б)Б даў катэгарычную дырэктыву ўсім партыйным арганізацыям аб тым, каб у бліжэйшы час дабіцца рашаючай перамогі ў выкананьні плянаў збожжазагатовак.

1-га студзеня канчаецца тэрмін вызначаны партыяй і ўрадам для поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак. Аднак, на 10 сьнежня плян выканан усяго прыблізна на 70 проц., прычым тэмпы загатовак за апошні час вельмі марудныя.

Праведзеныя перавыбары бюро ў большасьці раёнаў не далі рашучага пералому ў ходзе збожжазагатовак. Прычыны такіх ганебных тэмпаў тоіцца ў тым, што «некаторыя партарганізацыі і загатоўчыя органы замест руйнуючага ўдару па кулаку і яго агентуры ў партыі—правых і «левых» апартуністах, замест рашучай барацьбы са стаўкай кулака на зрыў загатовак, замест выкрыцьця яго новай тактыкі ў барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту (імкненьне ўвасьці ў калгасы і разбурыць іх з сярэдзіны, распальваньне спажывецкіх кулацкіх тэндэнцый сярод адсталых груп калгасьнікаў, выкарыстаньне гэтых калгасьнікаў у якасьці сваёй агентуры і г. д.), далусьцілі процістаўленьне з боку пасобных работнікаў і калгасаў мясцовых інтарэсаў, інтарэсам пралетарскай дзяржавы, што адбівае анты-партыйную кулацкую ідэалёгію і практыку» (з рэзалюцыі Лісталадаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Аналіз даны пленумам ЦК поўнасьцю застаецца ў сіле і на сёньняшні дзень. Матар'ялы са Слуцкага і іншых раёнаў гавораць аб тым, што і на сёньняшні дзень значная частка раёнаў яшчэ не разгарнулі сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за хлеб. Кулацкія месьніцкія тэндэнцыі яшчэ ня выкарчаваны ў радзе калгасаў і саўгасаў, што зьяўляецца прычынай таго, што значная частка калгасаў упарта ня выконваюць сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Падрыхтоўка да раённых партыйных канфэрэнцый павінна пакласьці канец такім ганебным тэмпам у ходзе хлебазагатовак, партыйныя арганізацыі павінны зараз-жа мабілізаваць усе сілы, кінуць на фронт збожжазагатовак свае лепшыя сілы з тым, каб у бліжэйшыя дні выканаць пляны збожжазагатовак.

Прыгожыя рэзалюцыі і ганебныя справы

У мінулым 1930 годзе Чырвона-Слабодзкі раён быў занесены на чорную дошку за слабае выкананьне плянаў загатовак хлеба, бульбы і лёну.

У гэтым годзе ня гледзячы на сотні прыгожых пастаноў райкома партыі, сельскіх ячэек і савецкіх устаноў аб тым каб, закончыць хлеба і бульба-загатоўкі да 1|XI, потым да 14 гадавіны Кастрычніка, потым да 15|XI, потым да 1|XII і нарэшце да раённай партканфэрэнцыі, мы на 1 сьнежня маем ганебныя лічбы выкананьня плянаў. (Па хлебу—57 проц., бульбе 75 проц., лёнавалакну 22,5 проц. і лёна-семя 59 проц.). Плян мабілізацыі сродкаў у IV квартале выканан толькі на 56 проц.

Прайшоўшая справаздачна-перавыбарчая кампанія нізавых парторганаў яскрава паказала прычыны такога ганебнага адставаньня.

6 умоў тав. Сталіна не ажыцьцяўляюцца, партячэйкі саўгасаў „Боркі Бялевічы", „Старчыцы" аб 6 умовах нават ня чулі.

Прафарганізацыя раёну ў загатоўках зусім ня ўдзельнічае. Некаторыя райкомы, праўда, вылучылі брыгады для дапамогі ў правядзеньні загатовак ў Чырвона-Слабодзкім сельсавеце, але брыгадзіры ні разу не заглянулі нават і ў канцылярыю савету Сацспаборніцтва паміж сельсаветамі на найхутчэйшае правядзеньне загатовак пачало разгортвацца толькі ў канцы лістапада. Вынікаў сацспаборніцтва яшчэ няма. Праца з беднатой амаль па ўсіх ячэйках адсутнічае.

Некаторыя ячэйкі, сельсаветы, як Старчыцы, Замагільле, Малышэвічы, груба скажаюць дырэктывы партыі і ўраду па пытаньні ўкамплектаваньня СТФ. У Старчыцкім сельсавеце „аўтарытэтная камісія" у складзе сакратара партячэйкі Альпяровіча, старшыні сельсавету Муравіцкага, дырэктара саўгасу „Старчыцы" Сахончука хадзілі па дварох і забіралі сьвінаматак на ўкамплектаваньне СТФ. „Левакі" за свае дзеяньні атрымалі толькі вымову.

Партгруп і партарганізатараў у цэхах і фэрмах саўгасаў „Боркі-Бялевічы", „Рачкавічы" і Старчыцы" да апошняга часу ня было. Пасьля гэтага ўпаўне зразумела чаму саўгасы ў загатоўках ніякага ўдзелу ня прымаюць.

Калгасы свой плян здачы таварных лішкаў дзяржаве далёка ня выканалі, бо ў калгасы „Прагрэс", „Воля", „Чырвоная Слабада" пралезьлі кулакі і заможнікі і нават сталі на чале гэтых калгасаў.

Да райпартканфэрэнцыі засталіся лічаныя дні. Гэтыя дні—рашаючыя ў галіне ліквідацыі прарываў—выкананьня плянаў загатовак. Канфэрэнцыя на аснове шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі павінна выкрыць канкрэтных носьбітоў зла і рашуча ўдарыць як па апартуністых—кулацкай агентуры ў радох нашай партыі, так і па прымірэнцах да іх.

Чырвона-Слабодзкая партарганізацыя можа і павінна забясьпечыць выкананьне загатовак усіх відаў.

С. Ш.

Слуцкая партарганізацыя не надала належнай увагі загатоўкам

За час дэкадніка штурму збожжазагатовак (20-30 лістапада) Слуцкі раён дамогся вялікіх посьпехаў, процант выкананьня пляну за гэты час узьняўся з 35 да 54 проц. Але раённыя арганізацыі ня здолелі надалей утрымаць узятыя тэмпы: ужо за першую пяцідзённку выкананьне павялічылася толькі на 2 проц. (з 54 да 56 проц.). Дасягнуўшы некаторых посьпехаў у часе дэкадніка партарганізацыя Случчыны і РВК на гэтым супакоіліся і аслабілі кіраўніцтва. У выніку гэтага рад сельсаветаў за першую пяцідзённку ў збожжазагатоўках адчыніна адсталі (Шышчыцкі с-с.—29,6 проц., Старэўскі—30,9, В.-Сьліўскі — 34, Палікарпаўскі—34,3). Няма ніводнага сельсавету, які-б выканаў плян больш як на 65,8 проц.

Замест яшчэ большага ўзьняцьця тэмпаў у збожжазагатоўках—у раёне назіраецца дэмабілізацыйныя настроі і прымірэнчыя адносіны да спагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможнай часткі.

Райкалгассаюз у шмат якіх калгасаў зьнізіў заданьні, зьменшыўшы, такім чынам, і ўдзельную вагу калгасаў у збожжазагатоўках. Напрыклад, Ленінскі сельсавет, калектывізаваны на 65 проц., а ў агульным пляне загатовак сельсавету калгасы займаюць толькі 28 проц.

Справа кантрактацыі збожжа па раёне заблытана Райкалгассаюзам. Кантрактацыйныя кніжкі РКС разаслаў не па ўсіх сельсаветах, дый у тых, якія разаслаў, не паказаў колькасьці закантрактаванага збожжа. Сельсаветы запоўнілі кніжкі мэханічна, без падаўленьня на культуры, у выніку чаго кантрактанты замест збожжа здаюць фураж. Лічбы кантрактацыі па многіх мясцох зьменшаны.

Цьвёрдыя заданьні спаганяюцца з кулацка-заможных гаспадарак вельмі марудна, асабліва па сельсаветах Кастрычніцкім, Шышчыцкім, В.-Сьліўскім і Старэўскім. У Ленінскім сельсавеце паводле пляну цьвёрдыя заданьні складалі 40 проц. усіх збожжазагатовак, але з часткі заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні зьняты,—усяго ў колькасьці 45 тон, і гэтая колькасьць зараз не рэалізавана.

У шмат якіх сельсаветах кулакі і заможнікі зрабілі недасеў плошчы, пахавалі частку збожжа.

Саўгасы таксама дрэнна выконваюць загатоўкі. Пастанова партыі аб здачы прадукцыі саўгасамі дзяржаве як быццам на Случчыне невядома.

Партыйныя арганізацыі раёну не зварочваюць дастатковай увагі на справу загатовак, ня гледзячы на тое, што яшчэ 2 сьнежня партактыў Случчыны даў абяцаньне сакратару ЦК КП(б)Б тав. Шаранговічу павялічыць тэмпы загатовак.

Гэтае абяцаньне партыйныя арганізацыі Случчыны раёну абавязаны выканаць.

Л. Хаўкін.

Кулацкія падпявалы з праўленьня калгасу „Добрая Воля" зрываюць збожжазагатоўкі

Калгас «Добрая Воля» Сергеевіцкага сельсавета, Пухавіцкага раёну вельмі адстае ў збожжазагатоўках. Прычынаю невыкананьня плянаў збожжазагатовак зьяўляецца месьніцкія тэндэнцыі, якім не даецца належнага адпору. Праўленьне калгасу на чале са старшынёй Зяньковічам увесь ураджай разьмеркавала сярод калгаснікаў.

Разьмеркаваньне ўраджаю калгасам праведзена так, што для здачы дзяржаве нічога не засталося. Прадукцыя калгасу, разьмеркаваная паміж калгасьнікамі значна перавышае іх сапраўдныя патрэбы. Некаторыя калгасьнікі атрымалі каля 13 тон бульбы і каля 5 тон збожжа.

У выніку такога «разьмеркаваньня» калгасьнікі, маючы вялікія лішкі збожжа і бульбы пачалі прадаваць іх на прыватным рынку.

Пухавіцкі райкалгассаюз павінен рашуча ўдарыць па канкрэтных правадніках кулацкіх месьніцкіх тэндэнцый з праўленьня калгасу «Добрая Воля». Партячэйка і сельсавет павінны зараз-жа шырока разгарнуць вакол збожжазагатовак палітычна-масавую работу і растлумачыць калгасьнікам палітычна-гаспадарчую вагу насьць збожжазагатовак. Плян збожжазагатовак калгас «Добрая Воля» павінен зараз-жа поўнасьцю выканаць.

В. Пілілчык.

Не кампанейскі, а штодзённа

змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

Кулака і яго агентуру—за борт калгасу

Аздаравіць калгас „Ясная паляна"

ШКЛОЎ. (наш кор.) Калгас „Ясная Паляна" адзін з буйнейшых калгасаў Загаранскага сельсавету. Гэты калгас яднае 125 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Аднак, у рабоце гэтага калгасу ёсьць рад грубейшых памылак і прарываў. Тут яшчэ панує абязьлічка і безгаспадарчасьць у калгаснай вытворчасьці.

Адсутнасьць зьдзельшчыны і кулацкая агітацыя прывялі да таго, што ў аддзяленьні калгасу „Дуброўна" з часу яго арганізацыі рабочая сіла ня была пераключана на працу ў калгасе, а калгаснікі працавалі выключна на сваей неабагуленай гаспадарцы.

У колгасе на зіму застаўся 1 га нявыбраных канапель, а выбраныя пагнілі на полі; засталося ня скошанай на полі 2 га грэчкі і 10 га насеннай канюшыны. 1 га аўсу прарос на полі ў пакосах і застаўся ня ўбраным; 130 коп разьбітага аўсу зьедзена коньмі на полі; 5 вазоў мокрага ячменю складзена ў гумно дзе ён гніе.

Жывёла ў калгасе знаходзіцца ў зусім дрэнных умовах. Каровы стаяць у гразі, кармушкі ўрасьлі ў гной, станкі ў сьвінарніках не ачышчаюцца. Сьвіньні кормяцца ільнянымі галоўкамі, неабваранай бульбай і вадой.

Праўленьне калгасу ня стала на чале організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня гаспадаркі. Старшыня колгасу Сілкоў набраў на сябе цэлы рад абавязкаў (загадчык фэрмы, скотнік, заўгас, палявод), а сваёй асноўнай работай не займаецца.

Партыйная ячэйка пры калгасе не паставіла ў цэнтр штодзённай сваёй работы падняцьце калгаснай вытворчасьці—арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу.

Шклоўскі райкалгассаюз, яснапалянская калгасная партячэйка, а таксама Загарніцкі сельсавет не паставілі сваячасова пытаньне аб ачыстцы калгасу ад кулакоў з тым, каб арганізацыйна ўмацаваць калгас.

Калгас „Ясная Поляна" павінен быць ачышчаны ад клясава-варожых элемэнтаў. Райкалгассаюз павінен неадкладна заняцца праверкай работы праўленьня калгасу і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве калгаснай вытворчасьці.

П. Шклоўскі

Ачысьціць калгасы Бярэзінскага раёну ад кулацкіх элемэнт

У Бярэзінскім раёне зусім не сьвяртаюць увагі на арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Многія калгасы засьмечаны кулацка-варожымі элемэнтамі, кулацтва пралезшае ў калгасы знутры імкнецца разваліць калгасную гаспадарку. Так, калгас імя Калініна, Белічынскага сельсавету знаходзіцца ў палоне безгаспадарчасьці. На чале кіраўніцтва калгасу стаяць замежнікі: Юк Цімох, Хаткевіч Антось і Юк Якаў.

Замест сталага апэрацыйнага кіраўніцтва яны наладжваюць сыстэматычныя п'янкі ў калгасе.

Арганізацыйная работа ў калгасе пастаўлена зусім дрэнна. Зьдзельшчына ня ўведзена. Яшчэ горшая справа ў калгасе „Дзьвігацель", Бярэзінскага рэёну.

Абязьлічка і безгаспадарчасьць вось галоўны тормаз у працы калгасу. На чале калгасу стаіць Букаты Сьцяпан. Выключна па яго віне сарвана сіласаваньне кармоў. Сена зараз скарыстоўваецца нерацыянальна. Пастаўленыя стагі першага ўкосу на палову страўлены. Рахункавод калгасу замест наладжваньня вучоту займаецца сыстэматычна п'янкай.

Трэба ачысьціць калгасы Бярэзінскага раёну ад кулацкага элемэнту і вывесьці іх у перадавыя рады.

Сымон

Дапамагчы калгасам Рагачэўскага раёну правільна разьмеркаваць ураджай

Разьмеркаваньне ўраджаю па калгасах Рагачэўскага раёну праходзіць недапушчальна марудныя тэмпамі. Райкалгассаюз недаацэньвае палітычнага значэньня правільнага і сваячасовага разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах, як магутнага вагара арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгаснае вытворчасьці.

У выніку гэтага, з маючыхся ў раёне 127 калгасаў папярэднюю работу па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю правялі толькі 98 калгасаў.

Калгасы: „Будзённы", „Полымя", „З рашаючы", „Дуброва" і інш. яшчэ зусім не прыступілі да работы па разьмеркаваньні ўраджаю.

У некаторых калгасах пры разьмеркаваньні ўраджаю дапушчаны грубыя скрыўленьні дырэктыўных органаў па гэтым пытаньні. Так, у калгасе „1 мая" (Запольскі сельсавет) ураджай бульбы разьмеркаваны па прынцыпе кулацкай ураўнілаўкі: кожны калгасьнік (незалежна ад таго, колькі працацадзён ён выпрацаваў) атрымаў па 3 вазы бульбы.

Трэба рашуча ўдарыць па кулацкай практыцы праўленьня калгасу „1 мая". Разьмеркаваньне ўраджаю правесьці пад лёзунгам „хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае". Опортуністычнай недаацэнцы правільнага разьмеркаваньня калгасных даходаў трэба пакласьці канец. Прарыў на гэтым важнейшым вучастку арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў павінен быць ліквідаваны. Ян Клімковіч

Кулакоў і іх агентаў--на лаву падсудных

Калгас «Ударнік», Убалацкага сельсавету, Клічаўскага раёну, арганізаваны ў 1930 г. Калгас мае ўсе ўмовы для шпаркага разьвіцьця, але-ж на сёньняшні дзень у гаспадарцы калгасу маюцца вялікія прарывы, безгаспадарчасьць. Прычынай гэтаму зьяўляецца тое, што як кіраўнікі калгасу, сельсавету, ячэйкі КП(б)Б, а таксама інструктар райкалгассаюзу тав. Саданові замест сапраўднага кіраўніцтва калгасам, замест арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня, сваімі правалявацкімі дзеяньнямі разбураюць калгас.

Старшынёй калгасу фармальна лічыцца бядняк Карчэўскі, а фактычна калгасам кіравала групка людзей, моцных заможнікаў. Загадчыкам гаспадаркі зьяўляецца Капусьцін, які летась плаціў 115 руб. падатку. Ня гледзячы на тое што меліся агульныя гумна, паводле распараджэньня Капусьціна, 80 га гароху складзена пад адкрытым небам, гарох згніў. Грэчку і канюшыну таксама згнаілі сена з 10 га засталося ў пракосах няўбраным.

Сакратар сельсавету, ён-жа член праўленьня, Сай Аляксей — моцны за можнік, сваімі ўчынкамі толькі разбураў калгас. Сям'ю сваю Сай пастараўся прыстроіць такім чынам: жонку—кладаўшчыком калгасу, якая, карыстаючыся сваім становішчам, разбазарвала прадукты харчаваньня; мат ка загадвала дзіцячымі ясьлямі; сястра—загадчык поштай. Сай Аляксей да апошняга часу, трымаў ва ўласным карыстаньні і неабагульваў дзьве каровы, малако-ж атрымліваў з калгасу.

Забраная ад кулакоў маемасьць падзелена паміж кулацкім «актывам». Дзялілі ня толькі сала і крупу, але і іншыя рэчы. У гэтым разбазарваньні актыўны ўдзел прымаў старшыня сельсавету Юркевіч і дзесятнік леспрамгасу Філіпаў. Філіпаў па цьвёрдых цэнах набраў у калгасе масла і сала на 180 руб., якія ён яшчэ і па сёньняшні дзень не заплаціў.

Інструктар райкалгассаюзу Салановіч які ня раз прыяжджаў у гэты калгас, замест таго, каб выкрыць злоўжываньні, сваёй дзейнасьцю дапамагаў гэтай групе разбураць калгас. Хто імкнуўся расказаць Салановічу пра злачынствы ў калгасе, таго разглядалі як «клясавага ворага». На адным сходзе Салановіч пагразіў: — «Сушыце сухары, вам месца ў Салаўках».

Пасьля такіх пагроз назаўтра раніцою 4 калгасьнікі (Зобаль—бядняк і інш.) кінулі калгас і паехалі на будаўнічыя работы ў Менск. Сам Салановіч пры заезьдзе ў калгас заўсёды атрымліваў па 2 кілё масла, прычым запісвалі гэтае масла на «Менскага брыгадзіра (няіснуючага) Трэйсьцера». Салановіч нават дамогся таго, што праўленьне калгасу пастанавіла адпусьціць яму калгасных сьвіней.

Як у калгасе, так і ў сельсавеце, поўны зажым самакрытыкі. За крытыку выжылі з калгасу бедняка Собаля, а лясьніку леспрамгасу Нарадоўскаму за тое, што ён крытыкаваў бязьдзейнасьць старшыні сельсавету Юркевіча, дзесятніку Філіпаву, далі цьвёрдае заданьне. Зараз як цьвёрдазаданьніка Нарадоўскага зьнялі з работы па намаганьні сельсавету і высяляюць яго з будынку.

У калгасе зьдзельшчына існуе фармальна. Адсутнічае прадысцыплліна. Кулацкія агенты злоўжываюць вучотам працы.

Так, Капусьцін і іншыя за 1 дзень «выпрацавалі» па 7 працадзён. Сакратар ячэйкі тав. Сямашка (былы сакратар Клічаўскага РВК) зусім даверліва аднёсься да гэтай зграі, чым дапамагаў разбураць калгас. Сакратар сельсавету Сай, каб выслужыцца перад Сямашкам, вазіў яму салому.

Усе гэтыя злоўжываньні і безгаспадарчасьць калгасьнікі выявілі на сходзе пры разьмеркаваньні прыбыткаў, але новы старшыня сельсавету тав. Мароз, стараецца ўладзіць усё мірным шляхам, каб замазаць усю гэту справу.

Клічаўская пракуратура павінна высьвятліць гэту справу. і асоб, якія разбуралі калгас, паставіць перад пралетарскім судом.

Д. В—н.

Раўняцца па калгасу „Чырвоны меч".

Калгас „Чырвоны меч" К. Борскага сельсавету, Бярэзінскага раёну перавыканаў плян збожжазагатовак на 6 проц., бульбазагатовак на 6,6 проц.

Плян мабілізацыі сродкаў калгас таксама значна перавыканаў. Астатнія калгасы Бярэзінскага раёну павінны браць прыклад з калгасу „Чырвоны меч".

В. С.

ТЭХНІКУ--УГУТУ

Цяжкая па сваім працэсам, поўная сакрэту шкляная прамысловасьць прад'яўляе свой рахунак рабочым вынаходцам і рацыяналізатарскім арганізацыям

Скарыстаць мясцовую сыравіну на патрэбы шкляной прамысловасьці

Рацыяналізацыю на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

Адказнасьць за выкананьнем пяцігодкі ў 4 гады, за выкананьне лёзунгу дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхнічных адносінах ў значнай ступені залежаць ад сацыялістычнай рацыяналізацыі. Яна сапраўды павінна служыць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, ўключацца ва ўсе поры вялікага арганізму сацыялістычнай гаспадаркі.

На справе наша рацыяналізатарская работа мае вялікія хібы пры ўсіх значных посьпехах, якіх мы дамагліся за апошнія гады.

Шкляная прамысловасьць патрабуе грунтоўнай рацыяналізатарскай работы. Ад капіталістычнага ладу ў галіне шкляной вытворчасьці мы атрымалі прымітыўныя, апошаныя гуты, якія патрабавалі капітальнага рамонту і абсталяваньня для таго, каб можна было на іх працаваць. Цяжкая ў сваіх працэсах, поўная сакрэтаў вытворчасьць пачала прад'яўляць свае рахункі рацыяналізатарскім арганізацыям.

Перад рацыяналізатарамі шкляной вытворчасьці ў выніку гэтага асабліва востра паўстала праблема апазу заводаў і мэханізацыі вытворчых працэсаў. Рацыяналізатары Белшклоаб'яднаньня правільна пачалі падыходзіць да разьвязваньня гэтай праблемы. Праблема апазу шкляных заводаў, як вядома, мае рашаючае значэньне. Ва ўмовах БССР гэтая справа палягчаецца тым, што мы маем нявычэрпныя магчымасьці ў скарыстаньні торфу, які з посьпехам можа замяніць дровы і іншы апал. Трэба толькі наблізіць тарфяныя базы да саміх заводаў, удасканаліць дарогі, каб гэты танны апал максымальна скарыстаць.

У пляне рацыяналізацыі Белшклоаб'яднаньня ёсьць цэлы рад мерапрыемстваў у гэтым напрамку. Так, да заводу «Домбаль» і «Камінтэрн» вызначана пабудова лежнявых дарог да тарфяных баз і мэханізацыя транспарту, што дасьць прыблізную эканомію ў 220000 руб. Апрача гэтага вызначана ў 1 квартале 1932 г. мерапрыемства для скарыстаньня адыходзячага газу на сушку пяска, што зноў дае эканомію ў апале.

У галіне мэханізацыі вытворчых і тэхналёгічных працэсаў плянам прадугледжана пабудова на заводзе «Домбаль», «Кастрычнік», «Камінтэрн» істужачных канвэераў, якія будуць падаваць вырабы ў гартавальныя цягуны, у пакавальныя цэхі і г. д., што дасьць эканомію часу і зьменшэньне бою шкляных вырабаў.

Апрача гэтага, у мэтах найлепшага скарыстаньня сыравіны, плянам прадугледжана замена старой канструкцыі бягуноў-драбілкамі для размолу.

Па шклозаводзе «Домбаль» асабліва каштоўнай зьяўляецца вынаходка мэханікам Сарокіным новай машыны для апрацоўкі краёў стаканаў. Гэтая машына, зробленая рабочым тагo-ж заводу дае значны эканамічны эфэкт. І замяняе саматужны ручны спосаб апраўкі краёў стаканаў машыным. Да ўстаноўкі машыны тав. Сарокіна завод ужо прыступіў. Гэты пачын, бязумоўна, трэба вітаць.

У далейшым рацыяналізатарам Белшклоаб'яднаньня неабходна павесьці яшчэ большую работу сярод БРЫЗ'аў па абмене вопытам, па заахвочваньні рабочага вынаходніцтва, што да гэтага часу было не наладжана.

Слабым месцам рацыяналізатарскай работы, а таксама навукова-тэхнічнай думкі трэба адзначыць недастатковую работу ў сэнсе скарыстаньня мясцовай сыравіны для вырабу шкла.

У далейшым трэба ўзьняць грамадзкую думку і адпаведныя арганізацыі (гарпром) вакол гэтых важнейшых пытаньняў, каб пасьпяхова іх вырашыць у бліжэйшыя часы. Уступаючы ў 1 квартал 1932 г. грамадзкія арганізацыі прадпрыемстваў павінны дапамагчы БР сваячасова падрыхтавацца да вырашэньня ўсіх закранутых у пляне мерапрыемстваў, а таксама дапоўніць іх сваімі прапановамі па кожным прадпрыемстве, каб сапраўды забясьпечыць выкананьне пляну рацыяналізацыі на першы квартал.

Д.

Лёгкаплаўкія гліны як сыравіна для шкляной прамысловасьці

Разьвіцьцё шкляной прамысловасьці ўзадпаведнасьці з хутка ўзрастаючымі запатрабаваньнямі нашага саюзу ўпіраецца ў адсутнасьць дастатковага снабжэньня лугамі, выкліканага адставаньнем разьвіцьця хэмічнай прамысловасьці.

Апрача гэтага, разьвіцьцё шкляной прамысловасьці, зьвязанае з яе раёнаваньнем, патрабуе значнага пашырэньня раённых, мясцовых сыравінных баз, каб па магчымасьці зьменшыць перакідку сыравіны на далёкія адлегласьці і загрузку транспарту.

Працы Інстытуту Шкла, праведзеныя за апошнія гады ў гэтым напрамку, значна пявялічылі нумэнклятуру сырых матар'ялаў. якія могуць быць скарыстаны для вырабу шкляной шыхты. Да гэткай сыравіны, на сёньня ўжо ўжыванай у шкляной прамысловасьці, належыць шэраг горных парод—трахіты, вулканічны попел Паўночнага Каўказу, пемза і г. д.

Асаблівай увагі і цікавасьці, па атрыманых выніках у Шкляной Сэкцыі Інстытуту Прамысловасьці заслугоўваюць лёгкаплаўкія гліны Шалашынскага месцанараджэньня, якія вялікімі масамі залягаюць блізка каля станцыі Хлюсьціна, недалёка ад Асін буду, каля вялізарных тарфяных масываў.

Гэтая гліна па свайму хэмічнаму складу зьмяшчае ўсе неабходныя для атрыманьня шкла кампанэнты і ў вельмі ўдалым спалучэньні: SiO_2—66 проц., Al_2O_3—14 проц., Fe_2O_3—4 проц, CaO—8 проц., MgO—4 проц., R_2O—3,5 проц.

Гэтая лёгкаплаўкая гліна можа быць выкарыстана як асноўная сыравіна для атрыманьня цьмянага бутэлечнага, прамтаварнага і інш. шкла, для якога колер (нарзанавай, баржомнай бутэлькі) ня мае значэньня.

Гэтая гліна выдатная тым, што ў склад шыхты яе магчыма ўвесьці ня менш 93 проц. і, што апрача невялікай дабаўкі лугоў не патрабуецца крэйды, вапняку. Замест пяску, соды або сульфату, крэйды і фарбоўніку, ужываных для атрыманьня цьмянага шкла, у гэтым выпадку патрабуецца толькі два матар'ялы—гліна і сульфат.

З шыхты, якая складаецца з 93 проц. гліны і сямі процантаў окісу натрыю пры значна зьніжаных супроць нормы, тэмпэратурах (на 150°) атрымана шкло прыкладнага складу: SiO_2—60 процантаў, Al_2O_3—13 проц., Fe_2O_3—4 проц., CaO—8 проц., MgO—4 проц., R^2O—10 проц.

Вырабы вышэйпаказанага складу ўладаюць высокімі мэханічнымі, тэрмічнымі і хэмічнымі ўласьцівасьцямі.

Для БССР значэньне гэтага ўдалага дасьледваньня заключаецца ў тым, што ёсьць магчымасьць высунуць пункт у ст. Хлюсьціна, як месца для пабудовы гуты, якая будзе забясьпечана сыравінай, апалам (тарфяныя масывы) і электраэнэргіяй (Асінбуд).

Праца гэтая, маючая вельмі важнае значэньне для нашай прамысловасьці, праведзена пад кіраўніцтвам праф. А. І. Кітай-Гародзкага, інж. А. М. Розіным і В. В. Лапацінскай у Інстытуце Прамысловасьці ВСНГБ у гор. Менску.

Дырэктар Інстытуту Прамысловасьці Слонім

За стандартную якасьць шкляных вырабаў

Да гэтага часу пытаньні якасьці прадукцыі разглядаліся асобна ад работы па стандартызацыі, і ўвесь удар у гэтай справе накіроўваўся галоўным чынам на аддзелы тэхнічнага кантролю прадпрыемстваў. Даваліся інструкцыі, складаліся акты, але належнага эфэкту ня было, бо пытаньне якасьці разглядалася пасобна ад тэхнічнага нармаваньня працы.

У гэтым асноўны недахоп у змаганьні за якасьць ня толькі шкляной вытворчасьці.

Бліжэйшай і чарговай задачай у гэтым напрамку павінна зьявіцца работа па ліквідацыі гэтага разрыву між пытаньнямі якасьці і стандартызацыі прадукцыі.

Работа па стандартызацыі ў гэтым напрамку дае шырачэзныя магчымасьці, але на жаль, да гэтага часу яна мала разгорнута. Месячнік стандартызацыі, які праводзіўся на прадпрыемствах, зварухнуў грамадзкую думку, але распачатай работы не замацаваў.

Тыя часовыя правілы і тэхнічныя ўмовы на выраб таго ці іншага прадукту галоўным чынам упіраюцца ў ёмка і дэталёва.

Да гэтага часу пытаньні якасьці прадукцыі разглядаліся асобна ад работы па стандартызацыі, і ўвесь удар у гэтай справе накіроўваўся галоўным чынам на аддзелы тэхнічнага кантролю прадпрыемстваў. Даваліся інструкцыі, складаліся акты, але належнага эфэкту ня было, бо пытаньне якасьці разглядалася пасобна ад тэхнічнага нармаваньня працы.

У гэтым асноўны недахоп у змаганьні за якасьць ня толькі шкляной вытворчасьці.

Бліжэйшай і чарговай задачай у гэтым напрамку павінна зьявіцца работа па ліквідацыі гэтага разрыву між пытаньнямі якасьці і стандартызацыі прадукцыі.

Работа па стандартызацыі ў гэтым напрамку дае шырачэзныя магчымасьці, але на жаль, да гэтага часу яна мала разгорнута. Месячнік стандартызацыі, які праводзіўся на прадпрыемствах, зварухнуў грамадзкую думку, але распачатай работы не замацаваў.

Тыя часовыя правілы і тэхнічныя ўмовы на выраб таго ці іншага прадукту галоўным чынам упіраюцца ў ёмка і дэталёва.

Серада.

2-хдзённік барацьбы з прарывамі на фронце ўсенавучу

Вынікі нарады ЦСПСБ і рэдакцый газэт „Савецкая Беларусь“, „ЗКП“ па рэалізацыі пастаноў аб школе

Гэтымі днямі ў культсэктары ЦСПСБ адбылася нарада апошняга сумесна з рэдакцыямі газэт «Савецкая Беларусь», «ЗКП», па пытаньні аб рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе і аб ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі і ўраду ў галіне ўсеагульнага абавязковага навучаньня. На нараду былі запрошаны прадстаўнікі цэлага раду ўстаноў і арганізацый, якія закліканы ажыцьцяўляць усенавуч і дапамагаць ажыцьцяўленьню апошняга.

Ня гледзячы на важнасьць пытаньня нарады, на апошнюю не зьявіліся прадстаўнікі ВСНГ, Белсампрамсаюзу і Белкаапсаюзу. Нельга не адзначыць таго, што прадстаўнікі апошніх сыстэматычна ігнаруюць нарады, якія скліканцца па пытаньні культурнага будаўніцтва. Адсутнічаў на нарадзе і прадстаўнік ЦП працасьветы.

З інфармацыяй аб становішчы ўсеагульнага навучаньня па БССР на нарадзе выступіў прадстаўнік НКА тав. Акулік.

Паводле даных Наркамасьветы на 20 лістапада школамі 1 канцэнтру ахоплена толькі 94,3 проц. дзяцей 8-11 гадовага ўзросту, між тым, як летась было ахоплена 98,7 проц. Яшчэ горш справа з ахопам школай пераросткаў, усяго толькі 91,6 проц.

У сучасны момант процант ахопу школамі дзяцей і пераросткаў яшчэ ніжэй, бо паводле тых даных, якія мае Наркамасьветы і якія мае рэдакцыя, на мясцох наглядаецца вялікі адсеў дзяцей са школ. Адна з прычын прарыву ў галіне ўсенавучу і адсеву школьнікаў—кепскае забесьпячэньне абуткам і вопраткай дзяцей. Наркамснаб за IV квартале плян забесьпячэньня школьнай вопраткай выканаў на 59 проц., а абуткам усяго на 44,6 проц. Да гэтага трэба дадаць, што Белкаапсаюз не раўнамерна пасылае на месцы гэтыя прамтавары—у адны раёны больш, у іншыя менш, ці зусім нічога. Нельга не адзначыць таго факту, што з адпушчанага для школ Наркамснабам на IV квартал пакуль што адгружана раёнам абутку 2,2 проц., а вопратні яшчэ менш.

У большасьці раёнаў для школьнікаў не арганізавана нават гарбата, бо каапэрацыя не адпускае цукру. Больш-менш здавальняюча пастаўлена арганізацыя гарачых сьнеданьняў для школьнікаў у прамысловых гарадох, але якасьць сьнеданьняў здавальняючай назваць нельга.

Дырэктывы партыі і ўраду па забесьпячэньні настаўніцтва ня выконваюцца, асабліва кепская справа ў сельскіх мясцовасьцях, дзе настаўнікі ў большасьці апроч мукі і круп (ды і то нерэгулярна) амаль нічога не атрымліваюць. Снабжэньне настаўніцтва прамтаварамі таксама не наладжана. Мясцовая каапэрацыя па цэлым радзе раёнаў ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду ў галіне забесьпячэньня настаўніцтва. З прымацаваньнем настаўніцтва да закрытых разьмеркавальнікаў і сталовых, у шмат мясцох ідзе валакіта. Нават у Менску шмат ненармальнасьцяй і недахопаў. Напрыклад, Менскі ЦРК прымацоўвае настаўнікаў да... няіснуючага разьмеркавальніка. Адкрыта ў Менску спэцыяльная сталовая, але... яна не для масавага настаўніцтва гораду, бо абеды спачатку былі па 45-50 кап., а зараз—ужо па 95—1 р. 45 кап. і настаўніцтва пачало адсейвацца.

Барацьба за палітэхнізацыю школы яшчэ ня стала ў цэнтры ўвагі гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый. Прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў вельмі затрымалася. Кепская справа з арганізацыяй рабочых пакояў і майстэрняў пры школах. НКА ў красавіку г. г. даў допіс у ВСНГ на неабходныя струманты і абсталяваньне, а Мэтаслёзаб'яднаньне толькі 28 лістапада піша службовую запіску ў ФЗВ пры заводзе «Ударнік»—«прапануем дагаварыцца з Наркамасьветы аб магчымасьці вырабу інструмэнтаў»... Па лініі Наркамснабу заяўкі на палітэхнічнае абсталяваньне выканаць толькі ў разьмеры ад 13 да 30 проц. Прадпрыемствы ў шмат якіх мясцох не дапамагаюць у абсталяваньні рабочых пакояў і майстэрняў. Такое становішча ставіць па пагрозу ажыцьцяўленьне палітэхнізацыі школы.

Плян школьнага будаўніцтва выкананы толькі на 41 проц.

Толькі 20-25 проц. школ БССР забясьпечана апалам.

Як гэта ня дзіўна, а прадстаўнік НКА ня мог сказаць на нарадзе аб тым, як ідзе барацьба за падвышэньне якасьці школьнай работы. Узорныя школы па раёнах, паводле слоў тав. Акуліка існуюць толькі на паперы, бо ў большасьці райінспэктуры нават не ўкамплектавалі іх кваліфікаванымі настаўнікамі. Мэтадычная дапамога настаўніцтву яшчэ не стаіць на належнай вышыні. Інструктары па раёнах ня вылучаны. Пачынаюць разгортваць сваю работу раймэтбюро і вялікую працу праводзіць грамадзкая інспэктура.

Прадстаўнік Наркамснабу на нарадзе ня мог нічога канкрэтна сказаць аб тым, як выконваецца дырэктыва апошняга аб забесьпячэньні школьнікаў і настаўніцтва. Наркамснаб задаволіўся тым, што адпусьціў фонды, а як гэтыя фонды прасоўваюцца на месцы і як яны скарыстоўваюцца кантролю па гэтаму не наладжана.

Прадстаўнік БДВ тав. Старавойтаў завастрыў увагу на тым, што падрыхтоўка новых праграм ідзе вельмі марудныміі тэмпамі, а за складаньне новых падручнікаў яшчэ ня браліся, ды пры адсутнасьці праграм іх нельга і складаць. Такое становішча пагражае тым, што да новага 1932-33 навучальнага году школы не атрымаюць падручнікаў.

ЦК УсеКП(б) даў дырэктыву з 1 студзеня пачаць работу ў школах па новых пераапрацаваных праграмах, а пры існуючых тэмпах яны да гэтага тэрміну ня будуць гатовы і ў лепшым выпадку, кажа тав. Старавойтаў, школы атрымаюць новыя праграмы ў сакавіку 1932 году.

З інфармацыі інспэктара Менскай гарінспэктуры тав. Наўменка, відаць, што спачатку навучальнага году ў горадзе школамі было ахоплена 100 проц., а па раёне 99 проц. дзяцей школьнага ўзросту. Зараз-жа назіраецца вялікі адсеў дзяцей вясковых школ, які ў сярэднім складае 40-45 проц. Кепска справа з забесьпячэньнем вучняў вясковых школ абуткам і вопраткай. Асабліва дрэнна справа з апалам для гарадзкіх школ, яны яго амаль не атрымліваюць. У Менску трэба арганізаваць 4 узорныя школы, а з 1 сьнежня арганізавана толькі адна. Па раёне арганізаваны 2 узорныя школы.

З інфармацый і спрэчак выявілася, што барацьба за якасьць школьнай работы, за палепшаньне мэтадычнага кіраўніцтва яшчэ не ўзьнята на адпаведную вышыню. Аб палепшаньні мэтадычнага кіраўніцтва гаворыць хоць бы той факт, як заявіў прадстаўнік 5-й менскай ФЗС, што яны сёлета яшчэ ня бачылі ў сябе ў школе інспэктара Нарасьветы. «Савецкая Беларусь» ня раз сыгналізавала аб тым, што ў раёнах справа з мэтадычнай дапамогай настаўніку не пастаўлена на належную вышыню.

На нарадзе выявілася, што ВСНГ, Белкаапсаюз, Белкалгасцэнтр, Белсампрамсаюз яшчэ не ўзяліся па баявому за рэалізацыю дырэктыў ЦК партыі аб школе.

Вылучана камісія для складаньня праекту рэзалюцыі для прэзыдыуму ЦСПСБ, які 15 сьнежня будзе абгаварваць пытаньне аб становішчы ўсенавуча. Нарада выказалася за тое, каб у бліжэйшыя дні распачаць рэйд ударных брыгад газэт «Савецкая Беларусь» і «ЗКП» і культсэктару ЦСПСБ для праверкі рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду аб усенавучы і мабілізацыі шырокіх мас рабочых і працоўных на рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе.

Пр цоўныя Рагачэўшчыны разгарнулі дадатковую падпіску

Рагачэў. Рабну дадаткова вызначана рэалізаваць пазыкі «3-га рашаючага» на суму 74 тысячы рублёў.

Працоўныя Рагачэўшчыны з вялікім энтузіязмам разгарнулі дадатковую падпіску. Так, рабочыя лесазаводу імя Халтурына падпісаліся на пазыку на 2130 рублёў. Прапаўчкі Рагачэўскага камсамольскага леспрамгасу дадаткова падпісаліся на пазыку на 25 проц. месячнага заработку, што складае 1400 рублёў. Шавецкая арцель «Аб'яднаньне» дадаткова падпісалася на пазыку таксама на 25 проц. месячнага заработку і г. д.

За два дні працы па дадатковай рэалізацыі пазыкі па горадзе Рагачэве рэалізавана 25.000 рублёў пазыкі «3-га рашаючага».

Той энтузіязм працоўных мас Рагачэўшчыны, які наглядаецца зараз пры дадатковай падпісцы на пазыку сьведчыць аб тым, што заданьне ў 74.000 руб. будзе выканана і перавыканана.

За „Чырвоную кнігу саветаў“

Стварыць спрыяючыя ўмовы

для работы Барысаўскага гарсавету

Адмовіцца ад канцылярска-бюракратычных форм працы, дабіцца зруху ў масавай рабоце местачковых саветаў

Дабіцца перамогі

З усіх канцоў БССР пачынаюць паступаць першыя весткі аб выкананьні праграмы—мінімуму, аб пасьпяховым ходзе соцспаборніцтва саветаў БССР за месца ў „Чырвонай кнізе“. У рапартох саветы паведамляюць аб сваіх дасягненьнях па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў, па выкананьні плянаў загатовак і мобілізацыі сродкаў.

Першыя весткі аб выкананьні самазабавязацельстваў, узятых на сябе саветамі, гавораць аб тым, што дамагчыся посьпехаў можна толькі ў выніку разгортваньня масавай работы, у выніку ўстанаўленьня моцнай сувязі з масамі рабочых, калгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадняковуў. Нарада гарадзкіх саветаў БССР, якая некалькі дзён таму назад скончыла сваю работу, канстатавала, што галоўным вагаром, які можа ўзьняць работу саветаў,—зьяўляецца масавая работа. Пастаноўка дакладу аб масавай рабоце саветаў на бліжэйшай сэсіі ЦВК зьяўляецца доказам таго, што партыя і ўрад падаюць асабліва важнае значэньне пытаньням прыцягненьня працоўных мас да справы кіраўніцтва дзяржавай.

Аднак, неабходна адзначыць, што ў многіх мясцох да гэтай работы яшчэ не падыйшлі шчыльна, што многія сельсаветы працуюць адарвана ад мас, спадзяючыся толькі на ўласныя сілы і апаратныя магчымасьці. Ёсьць яшчэ шмат фактаў, якія пацьвярджаюць тую акалічнасьць, што многія саветы, сэкцыі і дэпутацкія групы абмежаваліся адным уступленьнем у сацыялістычныя спаборніцтвы за месца ў „Чырвонай кнізе“, але не ўзяліся за канкрэтнае выкананьне сваіх абяцаньняў. Да такіх саветаў адносяцца ў першую чаргу Гомельскі гарадзкі савет, сэкцыя соцыялістычнага земляробства Віцебскага гарсавету, дэпутацкая група Менскага чыгуначнага вузла, сельсаветы Пухэўшчыны.

Сэсія ЦВК павінна быць пераломным момантам у разгортваньні масавай работы саветаў. Да канца гаспадарчага году засталося 18 дзён. Гэты кароткі тэрмін трэба скарыстаць для штурмавой работы па лініі выкананьня прамфінпляну рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці. Час, які застаўся, трэба скарыстаць для баявога выкананьня ўсёй праграмы-мінімуму, якая дае права для заняцьця пачэснага месца ў „Чырвонай кнізе соцыялістычных рапортаў саветаў“.

У ФОНД „Чырвонай Кнігі“

«Лічыць неабходным шырока прам'яваць саветы і паасобных работнікаў, якія выканалі праграму-мінімум і гэтым самым дамагліся права быць занесенымі ў «Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў саветаў».

З гэтай мэтай стварыць фонд «Чырвонай кнігі» пры прэзыдыуме ЦВК». (З пастановы сакратарыяту ЦВК БССР ад 1 лістапада 1931 г. № 19, § 2).

Народны Камісарыят Фінансаў БССР з мэтай прэм'яваньня лепшых ударнікаў фінансавага фронту, дэпутацкіх груп і фінансава-падатковых сэкцый, якія садзейнічалі пасьпяховаму выкананьню фінпляну 4-га кварталу і ўсяго 3-га рашаючага году пяцігодкі, — уносіць у фонд „Чырвонай кнігі“ 2000 руб.

Усяго паступіла ў фонд „Чырвонай кнігі“ на 13-е сьнежня 18500 руб.

Узьняць работу Барысаўскага гарсавету

(З агляду і праверкі работы Барысаўскага гарсавету).

Барысаўскі гарсавет, які абслугоўвае каля аднэй трэцяй часткі насельніцтва ўсяго раёну (больш 12.000 рабочых з прадпрыемстваў), ня стаў на чале ўзросшай актыўнасьці працоўных мас. У яго працы не знайшлі сабе адбітку новыя формы і мэтады масавага ўцягненьня працоўных у работу гарсавету. Гарсавет не перабудаваў сваёй працы тварам да вытворчасьці. У сыстэме кіраўніцтва Барысаўскага РВК над гарсаветам і ў разьмежаваньні адміністрацыйна-гаспадарчым правоў і функцый паміж гарсаветам і РВК існуе поўная абязьлічка і блытаніна. Ніводнага разу на працягу году не заслухоўвалася справаздача гарсавету на прэзыдыуме, альбо пленуме РВК. Пасяджэньні пленумаў гарсавету праводзіліся бяз усякага пляну: адзін раз у 2-3 месяцы. Старшыня Барысаўскага РВК адначасова зьяўляецца старшынёй гарсавету. Аналёгічная справа і з фінансавай часткай.

Той факт, што ў большасьці выпадкаў па пытаньнях гарадзкога характару насельніцтва гораду зварочваецца ў РВК, мінуючы гарсавет (нават і па такіх пытаньнях), паказвае наколькі гарсавет ня мае поўнага аб'ёму правоў.

Прэзыдыум гарсавету напрыклад за бараніў пабудову заводу на месцы, дзе меркавалася арганізацыя парку фізычнай культуры і адпачынку, але старшыня РВК, ня ведаючы аб гэтым, санкцыянаваў пабудову на гэтай плошчы стайні.

Дрэнна абстаіць справа з матар'яльна-фінансавай базай гарсавету. Фармальна асобны вылучаны бюджэт гарсавету самастойна ім не скарыстоўваецца. Цэлы рад крыніц папаўненьня бюджэту, як рачная пераправа, гарадзкая вага і інш., якія-б маглі даць дзесяткі тысяч руб. даходу ў бюджэт гарсавету, знаходзяцца ў распараджэньні пажарнай дружыны і лічыцца па-за бюджэтам гарсавету.

Аднак, было-б памылкова шукаць прычыны такога становішча гарсавету ў апякунстве і няправільным кіраўніцтве РВК, у неразьмежаванасьці правоў і функцый гарсавету і РВК. Надзвычайна вялікую ролю адыграла ў гэтым гаспэбна-дрэнная пастаноўка масавай работы. Новыя формы і мэтады працы, як сацпаборніцтва, ударніцтва, грамадзкія інспэктары, сацыялістычнае сумяшчальніцтва, грамадзкі буксір і г. д.—не знайшлі дастатковага праламленьня ў працы гарсавету. Сацыялістычныя сумяшчальнікі толькі «вылучаны».

З маючыхся 7 сэкцый гарсавету, працуюць больш-менш актыўна толькі 2—каапэрацыйная і РСІ. Астатнія лічацца на паперы. Сэкцыі сац. земляробства і прамысловасьці — былі распушчаны з-за бязьдзейнасьці, куль турна-асьветная засядала толькі 1 раз і разгледзела пытаньне аб разьмеркаваньні нагрузак і хадайнічаньне перад прэзыдыумам аб бясплатным праезьдзе на аўтабусе членам бюро сэкцыі.

Дэпутацкія групы, у якіх налічваецца больш 100 асоб на прадпрыемствах, амаль што зусім не працуюць і ня ўцягнуты як належыць быць у вырашэньне гаспадарча-палітычных задач.

Збор рабочых прапаноў па ўсіх галінах працы гарсаветам не праводзіўся. Справаздачы і пасяджэньні гарсавету на прадпрыемствах, як адна з форм масавага ўцягненьня працоўных у справу кіраўніцтва дзяржавай—не рабіліся.

Адна з прычын дрэннага становішча работы нізавых органаў савету ў Барысае—дэпутацкіх груп, сэкцый—заключаецца ў тым, што партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі не дапамагалі ў працы апошніх. Большасьць з іх ня ўключылі нават у плян працы сваіх арганізацый працу дэпутацкіх груп. Быў факт, калі сакратар парткамітэту Дрэваапрацоўчага камбінату ня ведаў аб існаваньні дэпутацкіх груп на камбінаце. Гэтае ігнараваньне і неацэнка работы гарсавету, у асаблівасьці, масавай работы апошняга, зьяўляецца праявай правага апартунізму на практыцы.

Неабходна мабілізаваць грамадзкую думку партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый для ўдзелу і дапамогі ў рабоце гарсавету.

А. Цэпаў.

Больш увагі рабочаму сацсумяшчальніцтву

Сацсумяшчэньне ў Бабруйску

недаацэнена і не разгорнута

Аднэй з новых форм прыцягненьня мас да справы кіраўніцтва дзяржавы зьяўляецца сацыялістычнае сумяшчэньне.

Работа вакол гэтай формы стала праводзіцца па г. Бабруйску з другой паловы г. г. Сацыялістычныя сумяшчальнікі абіраліся з ліку дэпутатаў Гарадзкога Савету, актыўных сэкцыянэраў і рабочых-ударнікаў, прычым вылучэньне ішло галоўным чынам ад прадпрыемства ў падшэфную яму ўстанову. Усяго было вылучана 48 сацсумяшчальнікаў. Вопыт іх работы па г. Бабруйску паказвае, што справе разгортваньня сацсумяшчэньня да гэтага часу аддаецца мала ўвагі.

ЦК і ЦКК КП(б)Б і ЦСПСБ у сваёй пастанове ад 9-га кастрычніка яскрава паказваюць, што **«справе наладжваньня шэфскай работы, разгортваньню сацсумяшчэньня ў масавай рабоце саветаў дагэтуль яшчэ аддаецца недапушчальна мала ўвагі з боку большасьці партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый, а таксама некаторых органаў КК РСІ, у выніку чаго ў значнай колькасьці выпадкаў шэфства заводаў і фабрык над савецкімі ўстановамі ня рушыцца далей урачыстых вечароў, абавязацельстваў і пасяджэньняў, само шэфства застаецца вядомым толькі вузкаму колу рабочых і не дае ніякіх практычных вынікаў».**

Паказанае становішча і адносіны да работы сацсумяшчальнікаў на сёньняшні дзень яшчэ маюць месца і па г. Бабруйску.

Дырэктывы ЦК і ЦКК КП(б)Б да гэтага часу вельмі слаба рэалізуюцца. Па большасьці прадпрыемстваў гэтая дырэктыва не даведзена ў поўнай мэры да шырокіх рабочых мас. Растлумачальная работа вакол пытаньняў шэфства і ў прыватнасьці сацыялістычнага сумяшчэньня непасрэдна на прадпрыемствах слаба разгорнута. Прафэсыянальныя арганізацыі недаацэньваюць сацсумяшчэньня як аднэй з асноўных форм у справе барацьбы з бюракратызмам, у справе арабачэньня савапарату. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі на прадпрыемствах яшчэ не ўявілі сабе пастановы ЦК і ЦКК аб прыцягненьні рабочых да работы ў савецкім апараце. Друк на мясцох (шматтыражкі, насьценгазэты) зусім нязначную ўвагу зварочвае на справу папулярызацыі шэфства і сацсумяшчэньня. Усё гэта разам узятае абумовіла паўсямесную слабасьць работы і нязначнасьць практычных вынікаў сацсумяшчэньня.

Дамо слова самім сацсумяшчальнікам:

Тав. Фішкін С. З., рабочы, наборшчык друкарні з 32-х гадовым вытворчым стажам:

«Я вылучан і працую сацсумяшчальнікам старшыні Цэрабкопу з верасьня г.г. Загадам па ЦРК праведзен толькі 20 лістапада. Наведваю Цэрабкоп часта пасьля работы і заўсёды па выхадных днёх. Да гэтага часу я яшчэ ня ўведзены ў курс справы, ніхто не дапамагае мне аўладаць тэхнікай работы, не даюць ніякай канкрэтнай работы. Я зьяўляюся ў ЦРК, як быццам ней кім наведвальнікам. Аб паседжаньнях праўленьне не заўсёды мяне паведамляе: удзельнічаў усяго на 2-х паседжаньнях».

Тав. Рагуцкі М. М.,—рабочы цеставод Хлебазаводу з 22-х гадовым вытворчым стажам:

«Працую сацсумяшчальнікам па Гарземчастцы з кастрычніка г. г., маю дапамогу ў сваёй рабоце. Працую па выхадных днёх. Практычныя вынікі маёй работы—звыш 20 абсьледваньняў забудоўшчыкаў, зямельных вучасткаў і інш.».

Тав. Догар А. А.,—рабочы фанцэху Камбінату з 21 гадовым вытворчым стажам:

«Высунут рабочымі Камбінату на пасаду сацсумяшчальніка старшыні Гарсавету. Прымаю ўдзел у паседжаньнях прэзыдыуму Гарсавету і ў розных нарадах. Самастойна прыём наведвальнікаў пакуль што не вяду з-за перагружанасьці. Дапамогу ў сваёй рабоце маю».

Тав. Новікаў Р. Л.,—рабочы па ачыстцы рынку з 41 гадовым вытворчым стажам:

«Зьяўляюся сацсумяшчальнікам заг. аддзяленьня Белсадгароднінны. Загадам не праведзены. Дапамогі ў рабоце ня маю, прадстаўлен сам сабе,—рабі як хочаш. Рабоце па сумяшчэньні аддаю шмат часу, наведваю ўстанову штодня, а таксама ў выходныя дні. Аб паседжаньнях мяне не паведамляюць і на іх не запрашаюць. Практычныя вынікі маёй работы: праверыў рад складаў і крам, выявіў і дабіўся зьнішчэньня раду недахопаў, правёў вытворчую нараду».

Тав. Клімовіч Я. С.,—вытворчы стаж 39 год. сацсумяшчальнік галоўнага ўрача больніцы:

«Загадам я не праведзены, наведваю ўстанову ва ўсе выходныя дні, дапамогі ў сваёй рабоце амаль што ніякай ня маю, канкрэтных абавязкаў ня маю, ніякіх практычных вынікаў сваёй работы ня бачу».

Тав. Гамзюк У. М.,—станкавы фанцэху Камбінату з 19 гадовым вытворчым стажам:

«Я зьяўляюся сацсумяшчальнікам жыльлёвага інспэктара Гарсавету. Сацсумяшчаньню аддаю значны час. Штодзённа наведваю ўстанову па некалькі гадзін, а таксама ў выходныя дні. Вяду самастойны прыём наведвальнікаў, удзельнічаю ва ўсіх паседжаньнях і нарадах. Маю дапамогу ў рабоце. Практычныя вынікі маёй работы: зрабіў каля 250 абсьледваньняў, выявіў і засяліў звыш 70 пакояў».

Такім чынам там, дзе сацсумяшчальнікам дапамагаюць у рабоце, там іх работа дае значныя практычныя вынікі.

Але вышэйпаказаныя прыклады з практычнай работы сацсумяшчальнікаў, калі дадаць да іх толькі тое, што з 48 сацсумяшчальнікаў па горадзе фактычна прыступілі да работы толькі 10-12, яскрава паказваюць, у якім становішчы знаходзіцца справа з сацсумяшчальніцтвам па г. Бабруйску.

Пералом у адносінах да шэфства і да сацсумяшчаньня павінен быць безадкладна зроблен.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі, ФЗК, Сэкцыі, дэпутацкія групы на мясцох і Гарсавет павінны павярнуцца тварам да шэфства, павінны прыняць актыўны ўдзел у справе арганізацыі сыстэматычнай барацьбы за палепшаньне, патаньне і арабачэньне савецкага апарату, за выкананьне завету У. І. Леніна аб тым, што «мэтай нашай зьяўляецца дарэмнае выкананьне дзяржаўных абавязкаў кожным працоўным».

ДЭПУТАТ.

У праверцы ня ўдзельнічае грамадзкасьць

Пытаньне праверкі становішча рацыяналізатарскай работы ў Наркамземе абгаворана партыйнай ячэйкай і мясцкомам. Вылучаны штаб, які на працягу ўсёй праверкі будзе кіраваць гэтай работай. Зараз пачаты збор прапаноў па палепшаньні рацыяналізатарскай работы. Рацыяналізатарам тав. Мерлавым распрацаваны мерапрыемствы па капіраваньню ў бухгальтэрыі, распрацавана пытаньне па структуры апарату, вывучана пытань не па палепшаньні кіраўніцтва раёнамі, арганізавана работа па кантролю выкананьня дырэктыў.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што ў праверку становішча рацыяналізатарскай работы ня ўцягнута грамадзкасьць. Насьценгазэта яшчэ не дастаткова асьвятляе ход праверкі, не арганізавала дагэтуль збор прапаноў па рацыяналізатарскай рабоце на далейшы час.

Надалей трэба арганізацыям Наркамзему больш надаць увагі рацыяналізатарскай рабоце, уцягнуўшы ў гэтую справу ўвесь актыў, рабочых шэфствуючых прадпрыемстваў і саўнамесьнікаў.

ВСНГ БССР павінен падцягнуцца

Недастаткова разгорнута праверка становішча рацыяналізатарскай работы ў ВСНГ БССР.

Складаныя мясцкомам брыгады па праверцы да гэтага часу яшчэ не прыступілі да практычнай работы. Насьценгазэта на праверку ўвагі актыву не мабілізавана. Ніводзін артыкул у гэтым кірунку зьмешчан у ёй ня быў.

Партыйэйка гэтым пытаньнем ня цікавілася. У выніку чаго яно не абгаворана нават і на агульным сходзе работнікаў ВСНГ.

Брыгада ЦКК-НК РСІ і газэты «Сав. Бел»: Сергеянка У. Л.

Раўняцца па перадавікох

(Вынікі ўсебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту)

Гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва ажыцьцяўляецца за кошт уласных накапленьняў краіны. Гэта абавязвае нас, побач з правадзімай энэргічнай працай за накапленьні ў прамысловасьці і іншых галінах народнай гаспадаркі, па бальшавіцку змагацца за далейшае прыцягненьне сродкаў працоўнага насельніцтва, за выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў на справу фінансаваньня гігантаў індустрыі, саўгасаў, калгасаў, МТС, сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне намечанай партыяй і рабочай клясай праграмы сацыялістычнай індустрыялізацыі і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, выкананьне пяцігадовага пляну ў чатыры гады, а па радзе галін народнай гаспадаркі і ў больш кароткі тэрмін, вялікі рост у сувязі з гэтым народных даходаў і дабрабыту працоўных мас ствараюць усе ўмовы ня толькі для выкананьня, але і для перавыкананьня нашых фінансавых плянаў.

Гэтым тлумачацца тыя вялізарнейшыя посьпехі, якія дасягнуты Савецкім Саюзам у справе ўзмацненьня і фінансавай базы, у справе выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў.

БССР мае значныя дасягненьні на гэтым адказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Паявілічэньне амаль у два разы мабілізаваных сродкаў насельніцтва за апошні год, атрыманьне ад працоўнага насельніцтва звыш 100 млн. рублёў толькі шляхам рэалізацыі пазык і прыцягненьня ўкладаў у ашчадкасы—з усёй выразнасьцю сьведчыць аб гэтым.

Але БССР значна адстае ад перадавых рэспублік і абласьцей Савецкага Саюзу.

Асноўнымі прычынамі адставаньня БССР зьяўляюцца недаацэнка справы, мабілізацыі сродкаў, кампанейшчына і ў першую чаргу слабасьць арганізацыйна-масавай работы ў радзе раёнаў.

Работа, адбыўшагася першага Ўсебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту сьведчыць аб тым, што ў гэтай справе маецца значны пералом. Самы факт скліканьня зьлёту, на якім былі прадстаўлены лепшымі ўдарнікамі фінансавай работы буйнейшыя прадпрыемствы, калгасы, партыйныя і прафэсыйныя арганізацыі, мясцовы друк, камсамол, чырвонасьцяжное настаўніцтва, фінансава-банкаўскі апарат, рапарты шмат якіх раёнаў, прадпрыемстваў і калгасаў,—усё гэта паказвае, што мабілізацыя сродкаў насельніцтва становіцца справай шырокіх рабочых і калгасных мас, савецкай грамадзкасьці.

Матар'ялы зьлёту прадстаўляюць надзвычайную каштоўнасьць з пункту гледжаньня скарыстаньня форм і мэтадаў работы перадавых раёнаў, сельсаветаў, прадпрыемстваў, калгасаў, лепшых ударнікаў з мэтай распаўсюджаньня іх вопыту на адстаючыя раёны і вучасткі работы.

На зьлёце з дастатковай яскравасьцю выявілася, што посьпехі перадавых гарадоў і раёнаў тлумачацца ў першую чаргу правядзеньнем сыстэматычнай масавай работы.

Кіруючыя арганізацыі Менску, Віцебску, Гомеля, Сіроцінскага, Заслаўскага і раду іншых раёнаў, паставіўшы мабілізацыю сродкаў насельніцтва як адну з важнейшых задач у сваёй рабоце, ўзяўшы пад штодзённы нагляд работу фінансава-крэдытнага апарату, ўсіх арганізацый і сельсаветаў,—асноўную ўвагу зьвярнулі на мабілізацыю працоўных мас на выкананьне фінпляну.

Вынікам гэтага зьявілася тое, што ў Менску, Віцебску, Гомелі на чале правадзімай работы па мабілізацыі сродкаў сталі рабочыя буйнейшых прадпрыемстваў: у Менску—заводу імя Варашылава, «Камунар», фабрыкі «1 мая», «Ударніка», у Віцебску—фабрыкі «Прафінтэрн», у Гомелі—заводу імя Ланцуцкага, Сельмаша і інш. Гэтыя прадпрыемствы зьявіліся апорнымі пунктамі ў сэнсе правядзеньня ўсіх фінансавых мерапрыемстваў. Пашыраючы свой вопыт на іншыя прадпрыемствы шляхам пасылкі буксірных брыгад для дапамогі адстаючым, шляхам разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва паміж прадпрыемствамі, аказваючы вялікую дапамогу падшэфным сельсаветам і калгасам, гэтыя прадпрыемствы давалі канкрэтныя і ўзорныя прыклады барацьбы за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. Дзякуючы гэтаму з кожным днём расьце сьпіс перадавых прадпрыемстваў, спаборнічаючых за пярэшнае. У Віцебску, напрыклад, зараз спаборнічаюць за пераходны сьцяг гарпрафсавету такія прадпрыемствы, якія не так даўно пляліся ў хвасьце па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў (фабрыка імя Лекерта, «Сьцяг індустрыялізацыі»).

Заводзкія арганізацыі перадавых прадпрыемстваў, правільна зразумеўшы дырэктывы партыі аб тым, што бяз строгага выкананьня фінпляну не магчыма ажыцьцяўленьне намечанага народна-гаспадарчага пляну, мабілізуюць на ажыцьцяўленьне гэтых дырэктыў усю рабочую масу. Характарна адзначыць выступленьне на зьлёце сакратара парткалкетыву заводу імя Варашылава тав. Хаскіна, які заявіў, што іх посьпехі—ёсьць вынік строгай увязкі выкананьня фінпляну з выкананьнем прамфінпляну ў штодзённай рабоце; праводзячы такім чынам работу сярод рабочых, мабілізуючы іх увагу на сходах, нарадах, праз друк, шляхам вывешваньня плякатаў, лёзунгаў і г. д.—калектыў змог дабіцца добрых вынікаў. Так праводзілася работа на іншых перадавых прадпрыемствах (завод імя Ланцуцкага, «Прафінтэрн» і г. д.).

Правядзеньне сыстэматычнай масавай работы на прадпрыемствах дае вялікія кадры новага фінансавага актыву, сапраўдных энтузіястаў і герояў фінансавага фронту, праваднікоў пасьпяховага выкананьня фінпляну з ліку лепшых ударнікаў-рабочых. Выкананьне фінпляну становіцца справай гонару цэлых калектываў. На зьлёце прыведзена шмат такіх фактаў. Вось, некаторыя з іх:

Толькі на адным заводзе імя Ланцуцкага, які шэфствуе над Гомельскім гарфа, ёсьць звыш 100 актывістаў. Прыняўшы актыўны ўдзел у ліквідацыі прарыву па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў па Гомельшчыне ў 3 квартале, рабочыя гэтага заводу і далей працягваюць сыстэматычную работу над выкананьнем фінпляну. Завод імя Варашылава, шэф НКФ, сыстэматычна вылучае брыгады для дапамогі адстаючым прадпрыемствам Менску. Брыгады гэтага заводу аказалі дапамогу ў разгортваньні фінэстафэты Віцебску і Барысаву. Прыкладу варашылаўцаў сьледуюць заводы «Камунар», «Ударнік», імя 1 мая і інш. Задача стварэньня сталага фінансавага актыву з рабочых пачынае практычна вырашацца і ў Віцебску.

У Менску, Віцебску, Гомелі ў рады фінансавага актыву ўлічаюцца члены сэкцыі і дэпутацкія групы гарсаветаў.

Вялікую ролю адыгрывае ў рабоце друк.

Выключнае значэньне мае вопыт у сэнсе перабудовы работы на вёсцы, якая да апошняга часу зьяўляецца найбольш адстаючым вучасткам у выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, асабліва па добраахвотных паступленьнях.

Пасьпяховае выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў у перадавых раёнах тлумачыцца строгай увязкай гэтай работы з правядзеньнем усіх гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы, рашучай барацьбой з апартуністычнай стаўкай на чарговасьць кампаній. У гэтых раёнах на справу прыцягненьня сродкаў мабілізаваны партарганізацыі, камсамол, прафсаюзы, у прыватнасьці саюз фінбанкаўскіх работнікаў, іншыя арганізацыі. Усё гэта пры чоткай рабоце фінансавага апарату і разгортваньні масавай растлумачальнай работы, спрыяла росту ўдарніцтва, сацыялістычнага спаборніцтва паміж паасобнымі сельсаветамі, калгасамі, брыгадамі і актывістамі.

Так, у Сіроцінскім раёне добра наладжана работа камісій садзейнічаньня, вакол якіх складаецца актыў з калгасьнікаў, актывістаў камсамольцаў, настаўнікаў; сыстэматычна на нарадах старшынь сельсаветаў, сельпо, заслухоўваецца ашчадных кас, сумесна з актывам робіцца абмен вопытам. Перадавыя сельсаветы і калгасы бяруць на буксір адстаючыя. Уведзена сыстэма прэм'яваньня лепшых сельсаветаў, калгасаў і ўдарнікаў; уведзена чырвоная дошка для перадавых сельсаветаў і арганізацый і чорная—для адстаючых. Скарыстоўваецца радыё-газэта. Ліквідавана абязьлічка—на кіраўніка кожнай арганізацыі ўскладзена пэўная адказнасьць за выкананьне заданьня. Апэрацыйнасьць у рабоце—напрыклад, работа па налічэньні абавязковых плацяжоў праведзена да тэрміну, што ў значнай ступені спрыяла іх пасьпяховым паступленьні; сваячасова ўжыты захады да спагнаньня плацяжоў з кулацкіх гаспадарак.

Аналёгічная работа праводзіцца ў апошні час у Заслаўскім, Бабруйскім, Лепельскім, Хойніцкім і радзе іншых раёнаў. Не выпадкова, што Заслаўскі раён прышоў на зьлёт з рапартам аб перавы

Лёзунгі да антыкаляднай кампаніі ў 1931 годзе

(Узгоднены з Агітпрапам ЦК КП(б)Б)

1. Барацьбою за тэхніку, за аграномічную навуку, супроць рэлігійнага мракабесься—узмацнім калгасы.

2. На вылазкі клерыкалаў і сэктантаў у дні каляд адкажам ростам ударных бязбожных брыгад і бязбожных калгасаў.

3. Арганізацыя працы ў калгасах, увядзеньне зьдзельшчыны, аўладаньне агра-тэхнікай—баявыя задачы бязбожнікаў.

4. Ператворым новабудоўлі ў асяродкі бязбожжа.

5. Узмацненьнем барацьбы з рэлігіяй дапаможам арганізацыйна-гаспадарчаму замацаванню калгасаў.

6. Супроць правага апартунізму і «лявацкіх» загібаў—за генэральную лінію партыі ў барацьбе з рэлігіяй.

7. За навуку, тэхніку—супроць рэлігійнага яду.

8. На клерыкальна-сэктанцкія каляды вылазкі адкажам 100 процантным выхадам на работу.

9. Антырэлігійную работу—на служ бу прамфінпляну.

10. Актыўным удзелам у сацыялістычнай перабудове гораду пасторым утварэньне сацыялістычнага бязбожнага быту.

11. Бязбожнікі! пад кіраўніцтвам партыі Леніна змагайцеся за пасьпяховае завяршэньне пяцігодкі за 4 гады.

12. Бязбожнік, у першыя рады лепшых ударнікаў на сацыялістычнай будоўлі.

13. Супроць вялікадзяржаўнага шавінізму і нацыяналізму, супроць рэлігійна-нацыянальнай варожасьці — за інтэрнацыянальнае адзінства працоўных.

14. На антысавецкія выступленьні замежных клерыкалаў адкажам узмацненьнем адзінага бязбожнага фронту працоўных.

15. Будзем удзельнічаць ва ўзмацненьні абароназдольнасьці СССР і магутнасьці Чырвонай армії, актыўна зьбіраючы сродкі на падводную лодку «Ваяўнічы Бязбожнік».

16. Узмацненьнем антырэлігійнай работы выхаваем новыя рады актыўных і сьвядомых барацьбітоў за сацыялізм.

17. Узброім працоўных марксыцка-ленінскай тэорыяй—магутным сродкам барацьбы супроць рэлігійнага мракабесься.

18. Піянэры і школьнікі—у бой за політэхнізацыю школы, у барацьбу з рэлігіяй.

19. За аслабаненьне працоўнай жанчыны ад рэлігійнага яду, за пабудову сацыялістычнага быту.

ЦС СВБ БССР.

Адзіным фронтам на барацьбу з бяспрытульнасьцю

Адозва да ўсіх дзяржаўных установаў, партыйных, камсамольскіх, прафэсыйных і грамадзкіх арганізацый, да шырокіх працоўных мас.

Па пяцігадоваму пляну народнае гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, вулічная дзіцячая бяспрытульнасьць павінна быць зьліквідавана ў 1931 годзе, а агульная—да канца 5-ці годкі.

Такое рашэньне камуністычнай партыі і ўраду.

Буйны гаспадарчы рост краіны саветаў і вялізарныя дасягненьні на фронце культурнага будаўніцтва пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і пры актыўным удзеле дзяржаўных установаў і грамадзкасьці, склалі неабходныя ўмовы для поўнай ліквідацыі дзіцячай бяспрытульнасьці.

У адпаведнасьці з гэтым і на грунце пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 25-XII б. г. Цэнтральнай Камісіяй Дапамогі дзецям пры ЦВК БССР, сумесна з НК Асьветы і Цэнтральным Саветам т-ва «Прыхільнік Дзяцей» праводзіцца з 15 сьнежня 1931 г. па 5 студзеня 1932 г. 2-х дэкадніх, які ставіць сваёй мэтай;

1. Поўную ліквідацыю ў БССР да 1-га студзеня 1932 году рэшткаў вулічнай дзіцячай бяспрытульнасьці.

2. Правядзеньне на месцах рашучых мерапрыемстваў па палепшаньню становішча дзіцячых дамоў, як з боку гаспадарчага іх забясьпечаньня, гэтак і пастаноўкі навучальна-выхаваўчае справы.

Праца дзіцячых дамоў ў перыяд рашучага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элементы па ўсяму фронту, у перыяд вырашэньня вялізарных задач на фронце культурнай рэвалюцыі, набывае вялікае палітычнае значэньне, як фарпосту па камуністычным выхаваньні дзяцей, па выхоўваньні з іх новай зьмены—стойкіх сьвядомых барацьбітоў за справу рабочае клясы, адданых будаўнікоў сацыялізму.

Гэты задачы могуць быць выкананы з посьпехам толькі тады, калі адпаведныя дзяржаўныя ўстановы, прадпрыемствы і шырокая савецкая грамадзкасьць прымуць актыўны ўдзел у гэтай палітычнай кампаніі, будуць ажыцьцяўляць штодзенна кіраўніцтва і грамадзкі кантроль над справай аховы дзяцінства і барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Цэнтральная Камісія Дапамогі Дзецям пры ЦВК БССР, НК Асьветы і Цэнтральны Савет ТПД заклікаюць ўсе дзяржаўныя ўстановы, прадпрыемствы, партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі і шырокія масы працоўных уключыцца ў правядзеньне 2-хдэкаднікі і рашуча, адзіным фронтам, пайсьці на змаганьне з рэшткамі дзіцячай бяспрытульнасьці, за сапраўднае камуністычнае выхаваньне падрастаючай зьмены.

Старшыня ЦКДД А. Чарвякоў.
Н. К. Асьветы Платун.

Старшыня Цэнтральнага Савету Т-ва «Прых. Дзяцей» Бялуга.

Бібліяграфія

П. ПРУДНІК, Т. ЛУКЗЯНЧУК і А. КАВАЛЕНКА. «У бой за пяцігодку». Чытанка для II групы школ перароскаў. Выпуск другі ДВБ. Менск 1931, стар. 166.

Чытанка складаецца з двох вялікіх разьдзелаў: «Будуем буйную сацыялістычную прамысловасьць» і «СССР і капіталістычныя краіны» і дапоўнена невялічкім разьдзелам «Сусьвет і месца ў ім нашай зямлі».

У аснову першага разьдзелу пакладзены пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі СССР, адкрываны славутым лістом У. І. Леніна да т. Кржыжаноўскага, у якім Ленін прапануе яму склясьці плян разьвіцьця народнай гспадаркі, які «праз 10—20 год зробіць Расію электрычнай». Як і трэба, аўтары з асаблівай увагай, да дробязяй, тут ня лішніх, абмалявалі зараджэньне пляну, апрацоўку яго, значэньне для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. У досьць яркім артыкуле «Агні пяцігодкі» яны абмалявалі зацьверджаньне пляну У Усесаюзным зьездам саветаў. Аўтары паказалі, што дасьць пяцігадовы плян у асноўных галінах народнай гаспадаркі. Разьдзел закончаны плянам «Трэцяга рашаючага». На гэтай аснове аўтары далі шмат практычных ведаў для вучня. У гэтым сіла разьдзелу.

Але аўтары чамусьці ні слова не сказалі пра пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР. Гэта было-б якраз дарэчы. Дзівіць таксама, што ў чытанцы няма асобнага артыкулу пра выкананьне пяцігодкі ў 3—4 гады, а па некаторых галінах і ў два з паловай! Такі артыкул у чытанцы вельмі і вельмі патрэбны.

Што да разьдзелу «СССР і капіталістычныя краіны», то ў ім трэба адзначыць слабасьць матар'ялаў пра Польшчу. Фашысцкая Польшча—гэта ланцужны сабака капіталізму, гняздо белагвардзейцаў. Гэта тут і ў Парыжы куецца зброя проці СССР і выдумляюцца розныя небылі, каб справакаваць СССР. Гэта фашысцкая Польшча арганізуе як мага сумежныя з СССР лімітрофы і баярскую Румынію, каб стварыць адзіны фронт проці СССР. І аўтарам трэба было з усёй сур'ёзнасьцю адносіцца да фашысцкай Польшчы. Паказаць яе ва ўсёй яе прагнасьці і ўсе яе магчымасьці, ды яе слабыя бакі. Аўтары-ж падышлі да яе з нейкім гурачаскокам. Так:

«А пакуль што насельніцтва ў Варшаве мільёна паўтара. Вайскоўцаў—хто іх зьлічыць (!). Вагзалаў—пяць, турмаў—таксама пяць. Вагзалаў пакуль што хапае, але турмаў мала і гэта вельмі непакоіць паноў. Рэвалюцыя расьце, а турмаў не хапае».

Так апісваць прымежную дзяржаву, у якой толькі і робяць, што шукаюць спосабу напасьці на СССР, так апісваць верагоднага ворага, які кожны год што-небудзь адчыбучыць (хоцьбы выцягне на сцэну, як нядаўна, Палякскага) проці СССР — дзяржавы пролетарыяту—нельга! Такі матар'ял не дае ніякіх ведаў, а толькі дэзарыентуе вучня. Варта-б было адзначыць нацыянальны склад фашысцкай Польшчы, паказаць на яе «лоскутнасьць». Гэтага аўтарамі ня зроблена і гэта вялікая загана разьдзелу. Апрача Польшчы не падана ніводнага радка пра нашых суседзяй-лімітрофаў, пра баярскую Румынію. Ня шкодзіла-б, каб аўтары далі вару радкоў і пра дружацкую нам Турцыю.

Разьдзел «Сусьвет і месца ў ім нашай зямлі» з боку навуковага кульгае амаль на ўсе чатыры, асабліва ў артыкуле «Ад чаго бывае дзень і ночь і розныя поры году». Тут аўтары проста прымушаюць зямлю танцаваць афокстрот». У іх «Земная куля падымаецца і апускаецца і ад гэтага ў нас бывае лета і зіма». Тымчасам жа як зьмена пораў году: вясны, лета, восені і зімы—паходзіць зусім не ад таго, што зямная куля «апускаецца і падымаецца», а таму, што зямля рухаецца вакол сонца, і што пры гэтым руху вось зямлі ўвесь час мае адзін і той-жа нахілены кірунак пад кутом у 23,5° да шляху зямлі вакол сонца. Аўтары павінны ведаць, што вышыня сонца залежыць ад таго, ці накіраваны полюс у бок сонца ці адхілены ад яго, а не ад таго што зямля апускаецца.

Простай недарэчнасьцю гучыць доказ аўтараў, чаму на экватары дзень заўсёды роўны ночы. Яны раяць вучню: «Падымайце і апускайце мячык, як вам захочацца; пераносьце яго ў якое хочаце месца вакол сьвечкі, заўсёды роўна палова экватару будзе асьветленай, а палова ў ценю...» Няпраўда! Хай паспрабуюць аўтары паставіць гэты досьлед самі і яны атрымаюць на экватары, пры іх мэтадзе, (як вам захочацца) зусім ня тое, што ім хочацца! Такіх елпацьеўскіх задач ня трэба, нельга і ня можна даваць! Або вось яшчэ доказ: «Абыйдзе зямная куля адну палову свайго кола параўняецца з сонцам (!), і яно стане сьвяціць роўна на паўночную і на паўднёвую паловы зямной кулі. Тады дзень роўны ночы, наступае восень». Глупства! Восень наступае не таму, што зямля параўняецца з сонцам!

Цікава ведаць, аб чым думаў рэцэнзэнт мэтадкому, калі ўхваляў гэтую недарэчнасьць да друку. Адсябліне, ненавуковасьці ня месца ў падручніку, хоць сабе ён і складзены для пераростка. Наадварот, тут як і ў кожным падручніку патрэбна найбольшая дакладнасьць, каб не забіваць галавы пераростку непатрэбным хламам.

Як на адну з хібаў падручніка трэба паказаць на тое, што ў ім шмат карэктарскіх памылак, якія скажаюць сэнс.

Кульгае на ўсе чатыры і стыль рэдактура. Тут сустракаюцца і мадэль (м. р.) і мадэля (ж. р). Тут сустракаецца і адмысловае кола (!); паралелі называюцца і роўналежнымі коламі і паралелямі. І гэта нават у адным артыкуле. Пояс (кліматычны) называецца і пасам і поясам. Мячык «уяўляў земную кулю», калі мячык наогул нічога ня можа ўяўляць, а можа толькі станавіць сабою або прадстаўляць з сябе што - небудзь і г. д. і да т. п.

Наколькі першы разьдзел адпавядае свайму прызначэньню складзены вельмі ўдала, настолькі паслабелі апошнія два разьдзелы, нібы аўтарам надаела складаць, а рэцэнзэнтам, чытаць і правіць. Атрымліваецца такое ўражаньне, што пад канец рукапісу яны махнулі рукою: Ат, хай будзе, што будзе!

Да падручніка так адносіцца нельга!

Ськіркоўка.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

па дакладу старшыні Тураўскага РВК і садакладу інструктара Аргінстру Прэзыдыуму ЦВК БССР—аб ходзе калектывізацыі і спэцыялізацыі раёну.

Заслухаўшы даклад Старшыні Тураўскага РВК і садаклад Інструктара Аргінстру Прэзыдыуму ЦВК БССР—аб ходзе калектывізацыі і спэцыялізацыі раёну, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэтут БССР адзначае:

1. Тураўскі РВК і шэраг сельсаветаў да апошняга часу яшчэ не перабудавалі сваёй работы, дапасавана да сучасных задач сацыялістычнага будаўніцтва, да задач арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў і спэцыялізацыі раёну, як жывёлагадоўчага.

Зусім марудна ідзе арганізацыя і ўкамплектаваньне таварных фэрм (малочныя фэрмы ўкамплектаваны на 76 проц., птушкаводныя—23 проц., сьвіноводныя—28,7 проц.), будаўніцтва ў калгасах поўнасьцю сарвана: з 11 сьвінарнікаў ніводзін не пабудаван, адкормачныя пункты таксама не пабудаваны, што зьяўляецца вынікам поўнай бяздзейнасьці, бездзядказнасьці і правапартыйстычнай практыкі раённых арганізацый да важнейшай справы—разьвіцьця жывёлагадоўлі.

2. Калектывізацыяй на 20-X-1931 г. ахоплена 44,2 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, але РВК і сельскія саветы не паставілі ў цэнтры сваёй працы арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, як галоўнейшай задачы на даным этапе; масавая работа саветаў вакол гэтага пытаньня ў раёне зусім не разгорнута (з 32 калгасаў пераведзена на зьдзельшчыну—29, ураджай разьмяркованы па 6 калгасах) па шэрагу калгасаў зьдзельшчына праводзіцца фармальна.

Выкананьне плянаў палітычна-гаспадарчых кампаній не ўвязана з арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньнем калгасаў, разьмеркаваньне прыбыткаў праводзіцца без мабілізацыі на гэту справу калгасных мас; кампанія гэта фактычна прадастаўлена самацёку.

Выходзячы з вышэйадзначанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

а) Прапанаваць Тураўскаму РВК: паставіць цэнтральнай, галоўнай задачай арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў (укараненьне зьдзельшчыны, арганізацыя працы, ліквідацыя абязьлічкі, укараненьне сацспаборніцтва і ўдарніцтва), увязваючы гэтую работу з правадзімымі палітычна-гаспадарчымі кампаніямі;

б) рашуча ўзмацніць работу саветаў па асноўнай галіне сельскай гаспадаркі раёну—жывёлагадоўлі, разгортваючы вакол гэтага пытаньня масавую работу саветаў, праз рашучае ажыцьцяўленьне дзейнасьці сельсаветаў, сэкцый, арганізацыю дэпутацкіх груп; паставіць на належную вышыню работу вытворчых нарад, груп беднаты, зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў працу вытворчых нарад—жанчын—калгасьніц і перабудаваць работу саветаў такім чынам, каб пытаньні разьвіцьця жывёлагадоўлі, вырашэньня кармавой праблемы зьяўлялася бальшавіцкай творчасьцю саветаў і ўсіх устаноў раёну;

в) пляны разьмеркаваньня даходаў шырока абгаварыць на калгасных сходах, даючы рашучы адпор кулацкім імкненьням ажыцьцявіць ядоцкія прыцыпы разьмеркаваньня;

г) райвыканкому і сельскім саветам заслухоўваць кожную дэкаду на сваіх пасяджэньнях даклады прымацаваных членаў Прэзыдыуму РВК, старшынь калгасаў і кіраўнікоў вытворчых нарад аб ходзе гэтай работы;

д) ужыць бездакладна рашучыя захады да захаваньня жывёлы ў раёне, вядучы жорсткую барацьбу супроць кулацкіх тэндэнцый зьнішчэньня жывёлы, побач з гэтым бездакладна давесьці кантрольныя лічбы па вырашчываньні жывёлы да сельскіх саветаў, вёсак і кулацка-заможных гаспадарак, мабілізуючы на гэту справу савецкі актыў, калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў;

е) сілы жывёлагадоўчы ухіл раёну, лічыць, як важнейшую задачу, стварэньне кармавой базы, для чаго зьвярнуць увагу на карэннае палепшаньне сенажаций праз мэліярацыю, выкарчоўку і г. д.

Арганізацыю фэрм вытварць на грунце дасканалага вывучэньня эканамічных умоў калгасу, каб гэта спрыяла больш шырокаму разгортваньню спэцыялізацыі, барацьбе за павялічэньне таварнасьці і за сваячасовую і поўную здачу сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве;

ж) мабілізаваць бездакладна ўвагу сельскіх саветаў і грамадзкасьці раёну на справу выкананьня фінансавага плану; забясьпечыць бязумоўнае выкананьне вызначаных заканадаўствам тэрмінаў паступленьня абавязковых плацяжоў і сыстэматычную арганізацыйна-масавую работу па мабілізацыі добраахвотных плацяжоў насельніцтва;

з) ужыць рашучыя захады да ліквідацыі ўсіх прарываў, што маюцца ў галіне нарыхтовак, паставіўшы гэту работу ў цэнтры ўвагі РВК, саветаў і ўсёй савецкай грамадзкасьці. Бездакладна прыняць крокі да поўнага выкананьня кулацка-заможнымі гаспадаркамі цьвёрдых заданьняў.

2. Аргінструктарскаму Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР праз 6 месяцаў праверыць выкананьне гэтай пастановы і даложыць на Прэзыдыуме ЦВК БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гілякевіч.
17 лістапада 1931 г.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб забароне дзяржаўным установам і арганізацыям патрабаваць ад грамадзян прадстаўленьня даведак аб наяўнасьці выбарчых праў

За апошні час некаторымі цэнтральнымі ўстановамі і мясцовымі органамі ўлады вызначан парадак, па якому ў тых альбо іншых выпадках, не прадугледжаных законам, (прыпіска на жыхарства, ўзяцьце на вучот органамі працы, паступленьне ў навучальныя ўстановы і г. д.) грамадзяне абавязваюцца пацьвердзіць аб наяўнасьці ў іх выбарчых правоў адпаведнымі даведкамі. Такі парадак не дае магчымасьці ажыцьцяўляць працоўным дадзеныя ім правы і стварае непатрэбную работу для органаў улады па выдачы паказаных даведак.

У мэтах зьнішчэньня паказанага парадку, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Забараніць усім дзяржаўным установам і арганізацыям патрабаваць ад грамадзян прадстаўленьня даведак аб наяўнасьці ў іх выбарчых правоў.

2. Дзяржаўныя ўстановы і арганізацыі ў неабходных выпадках могуць атрымаць даведкі аб выбарчых правах тых альбо іншых грамадзян непасрэдна ў самых грамадзян шляхам іх апытаньня, запаўненьня анкеты і г. д. пад асабістую адказнасьць асобы, якая дае весткі, а пры сумненьні ў правільнасьці дадзеных вестак—шляхам запытаньня належных органаў улады.

3. Прапанаваць Пракурору Рэспублікі даць паказаньні сваім мясцовым органам аб неабходнасьці ўзьняцьця прасьледаваньня ў крымінальным парадку ў адносіне тых асоб, якія далі няправільныя весткі аб наяўнасьці ў іх выбарчых правоў, і якія карысталіся ў зьвязку з гэтым правамі, што ім не належаць.

4. Прапанаваць народным камісарыятам і іншым цэнтральным установам скасаваць свае пастановы і загады, якія супярэчаць гэтай пастанове, а таксама ўжыць належныя захады аб скасаваньні гэтых загадаў падпарадкаваных ім органаў і ўстаноў.

5. Прапанаваць народнаму камісарыяту юстыцыі БССР у двухдэкадны тэрмін распрацаваць і падаць на разгляд заканадаўчых органаў праект пастановы аб зьменах у існуючым заканадаўстве БССР, якія выцякаюць з гэтай пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гілякевіч.
17 лістапада 1931 г. г. Менск.

Слова за ГарКК і пракуратурай

Апарат Наркамснабу Беларусі выканаў не адну адказную сельска-гаспадарчую работу, але поруч з гэтым, у апараце ёсьць цэлы рад буйнейшых недахопаў, аб чым ня раз сыгналізавалася на стараонках нашай газэты. Трэба сказаць, што да гэтых сыгналаў друку як кіраўніцтва Наркамснабу, так і бюро ячэйкі КП(б)Б і прафарганізацыя адносіліся ня чула і не рэагавалі на сыгналы друку, упарта працягвалі маўчаць.

У апараце Наркамснабу ня любяць, калі прадстаўнікі рэдакцыі заходзяць у апарат. Рад фактаў сьведчаць аб тым, што ў апараце НКСнабу панує за жым крытыкі і самакрытыкі як наогул, так і праз друк у прыватнасьці.

7 лістапада ў нашай газэце быў зьмешчаны артыкул, аб ганьбіны на вылучэнку, члена КП(б)Б з 1920 г., з 20-гадовым рабочым стажам тав. Бабіцкую. Праўда, гэтай справай зай малася спэцыяльная камісія і бюро ячэйкі НКСнабу, але займаліся справай Бабіцкай ізалявана ад усёй пастаноўкі работы з вылучэнцамі. Дарэчы трэба адзначыць, што ячэйкі некаторыя з адказных работнікаў нават на пашыраным бюро ячэйкі імкнуліся працягнуць і далей зьдзекі над т. Бабіцкай, даказваючы што Бабіцкая не жадае працаваць у апараце НКСнабу, не зацікаўлена работаю і наогул нездольна да працы. Справу Бабіцкай не ўзьняла на належную прынцыповую вышыню і не абгаварылі не ў масавым парадку на партыйных і прафсаюзных сходах.

Акрамя справы т. Бабіцкай усплыла новая справа: абвінавачваньне тав. Аксёнчыка, рабкора ў няправільнай інфармацыі газэт аб становішчы ў апараце, склалі яму такія ўмовы, што ён прымушаны падаць заяву аб уходзе з апарату.

Ненармальнае рэагаваньне на допісы зьмешчаныя ў насьцепгазэце. Напрыклад, член мясцкому т. Навіцкі перад асобнымі работнікамі заяўляў, што за зьмешчэньне артыкулу аб тав. Бабіцкай трэба даць па галаве рэдкалегіі. Адказны работнік т. Бэйлінаў патрабаваў ад рэдактара насьцепгазэты т. Пракаповіча даць сапраўдную ацэнку зьмешчанага артыкулу аб тав. Бабіцкай. Сучасны старшыня мясцкому т. Праображэнскі перад масай работнікаў заяўляў аб тым, што насьцепгазэта займаецца гнупствамі. Зразумела такія адносіны да рэдкалегіі не магчі не адбіцца на рабоце рэдкалегіі. Па прычыне гэтага рэдактар т. Пракаповіч быў вымушан падаць заяву аб уходзе з апарату Наркамснабу.

Паміж адказнымі работнікамі і радавымі выканаўцамі існуюць ненармальныя ўзаемаадносіны, што паслужыла прычынаю амаль масавай падачы заяў аб уходзе з апарату. Напрыклад, падалі заявы тт. Безбародаў, член КП(б)Б з 1918 г., Цітоў, член КП(б)Б з 1925 г., Аксёнчык, член КП(б)Б з 1928 г., Пракаповіч, член КП(б)Б і цэлы рад беспартыйных радавых работнікаў.

Нельга лічыць нармальным той факт, што бюро ячэйкі КП(б)Б рэкамандавала ў новы склад мясцкому гр-на Міньковіча, які больш за ўсіх зьдзекваўся над т. Бабіцкай.

Разам з гэтым у апараце ёсьць моманты парушэньня тарыфнай дысцыпліны. Напрыклад, па тарыфнай сетцы належыць выплачваць 150 руб., а на справе выплачваецца 175 руб. У зарплаце ў апараце Наркамснабу ёсьць агульная ўраўнілаўка, што таксама парушае тарыфную сетку.

Нядаўна па пастанове калегіі Наркамснабу прыцягнуты да судовай адказнасьці т. Безбародаў за невыкананьне дырэктывы аб'яднаньнем «Белмяса» па выдачы прэміі за лепшае выкананьне загатовак асобнымі раёнамі. Цікава, што т. Безбародаў прыцягнуты да адказнасьці за тую пастанову, аб якой ён зусім ня ведаў і даведаўся тады, калі яго выклікаў сьледчы па важнейшых справах, г.зн. 11-XI—31 г. Гэта іншы нельга тлумачыць як простым падсежваньнем.

На сёньняшні дзень апаратам Наркамснабу не складзен народна-гаспадарчы плян загатовак і снабжэньня на 1932 г. Гэты прарыў быў заўважаны своячасова камсамольскай ячэйкай і для ліквідацыі яго ячэйка абвясьціла штурм. Аднак, гэтая ініцыятыва камсамольскай ячэйкі ня была падхоплена і фактычна ініцыятыва ячэйкі павісла ў паветры.

Масавая выхаваўчая работа ў апараце Наркамснабу адсутнічала і адсутнічае. Ніякай работы не вялася ня толькі з вылучэнцамі, але таксама і не праводзілася з маладымі спэцыялістамі, якія нядаўна прыйшлі ў апарат.

Член рэдкалегіі т. Касьяненкі сакратару камсамольскай ячэйкі т. Яхкінд заявіў: «Пасьля справы тав. Бабіцкай, крытыкуючых матар'ялаў апарату і пасобных адказных работнікаў не зьмяшчаю» і адмовіўся зьмесьціць выкрываючы артыкул, напісаны ёю.

Паданыя факты сьведчаць, што ўнутранае становішча апарату Наркамснабу не забясьпечвае бальшавіцкіх тэмпаў. Адсутнасьць плану нельга інакш тлумачыць як праваапартуністычным спадзяваньнем на самацёк, безадказнасьцю, абязьлічкай у рабоце апарату.

ГарКК павінна палажыць канец тым хваравітым зьявішчам, якія назіраюць у апараце Наркамснабу.

Парафянюк.

Неправільна разгрузіць склады

Пастанова пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б не знайшла належнага водгуку на станцыі Слуцак.

Складскія памяшканьні чыгуначнай станцыі Слуцак завалены грузам, з прычыны чаго грузы звальваюцца паа адкрытае неба і псуюцца.

Райспажыўсаюзы і райкаапсаюзы Капыльскага, Старобінскага і Чырвона-Слободзкага раёнаў не забіраюць свае часова сваіх тавараў, якія псуюцца на дварэ.

Саюзтранс таксама ня прымае ніякіх мер да зьнішчэньня гэтага агіднага зьявішча.

Як мясцовыя, і раённыя арганізацыі яшчэ не прадставілі сваіх плянаў па перавозцы. Падводы затрымліваюцца звыш устаноўленага тэрміну пад пагрузкай і выгрузкай. Ёсьць моманты калі прамсаюз пасьля 17 гадзін адмаўляе сваёй кліентуры адчыніць склады для прыёму грузаў.

Грузы да адпраўкі райкаапсаюзам і Белплодагароднінай не падрыхтоўваюцца па 2-3 тыдні і больш.

Падъезды знаходзяцца ў дрэнным становішчы і ніхто не клапоціцца аб тым, каб іх прывесьці ў парадак.

Вылучаная райвыканкомам тройка па разгрузцы станцыйных складаў бязьдзейнічае.

Інспэкцыі працы было дзручана зкантрактаваць 50 калгасных падвод, але да гэтага часу нічога не зроблена. Саюзтранс яшчэ не ліквідаваў абязьлічку як на самой станцыі, так і на складах і ў рабоце гужавога транспарту.

Чыгуначныя арганізацыі ст. Слуцак, павінны рашуча ўзяцца за перабудову сваёй работы ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду.

А. Курдо.

Недастаткова падрыхтаваліся

5 сьнежня адбылася Аршанская раённая нарада старшынь ФЗМК, на якой падводзіліся вынікі справаздачна-перавыбарчай кампаніі прафарганізацый.

За час перавыбараў райпрафсавет праёў 2 раённыя інструкцыйныя нарады старшынь ФЗМК, зьлёт агульнагарадзкога прафактыву, зьлёты ўдарнікаў на прадпрыемствах і ўстановах, увесь склад прэзыдыуму РПС быў прымацаваны да буйнейшых прадпрыемстваў і ўстаноў Аршанскага раёну...

Але-ж ня гледзячы на гэта, па раду буйнейшых прадпрыемстваў Аршаншчыны ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі быў рад скажэньняў у выніку чаго райпрафсавету прышлося скасаваць перавыбары ФЗМК на Аршанскім лесазаводзе, па саюзу дзяржуставоў, саўгасу Бабінічы і інш.

Зьвесткі, якія ёсьць у райпрафсавеце (з 29 прафарганізацый—замест 53) паказваюць, што з 6000 чал. рабочых прафчленствам ахоплена толькі 1168 чал., заяў у рады КП(б)Б пададзена 174, у камсамол 198, рост ударнага руху павялічыўся на 633 чал.

Пераабраны 17 мясцкомаў, месцы значны эрух у павышэньні прафкваліфікацыі. Рабочых прапаноў паступіла: 129 вытворчага характару і 29 па палепшэньні прафработы. Гаспадарча-разьліковых брыгад зараз налічваецца 49 з ахопам 608 чалавек, у той час як да перавыбараў ФЗМК, ня было ніводнай.

Трэба адзначыць, што падрыхтоўка да 4 заключнага году пяцігодкі правядзіцца марудна. Кантрольныя лічбы яшчэ не распрацаваны, адсутнічае сустрэчнае плянаваньне, работа з вядучымі прафсэкцыямі і інш.

Хазан І. М.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Дом працасьветы. 14-XII г.г., а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца антырэлігійны вечар. 1. Даклад праф. Бузука. Пасьля кіно.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОР.

14 сьнежня г.г. а 7 гадз. увечары ў паляшчанскім клюбу камунальнікаў (Няміга, 8)

АДБУДЗЕЦЦА

ПАСЯДЖЭНЬНЕ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ

камунальнай і бытавой сэкцыі

ПАРАДАК ДНЮ: 1. Даклад Абкантрэсту, 2. Садаклад Гаржыласаюзу, 3. Кіно.

Запрашаюцца рабочыя прадпрыемстваў гор. Менску

БЮРО СЭКЦЫІ

Гукавы кіно-тэатр ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Пач. 5-45, 7-30, 9, 10-30. Каса з 1 дня

Мастацкі фільм ЧАЛАВЕК З ТУРМЫ

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА Пач. а 7, 8-45, 10-20. Каса з 5

Мастацкі фільм Токар Аляксеєў у 6 частках. Звыш праграмы Тахнічная Да амога

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Пач. 2, 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30. Каса з 12

Комэдыя ў замежным фільме МАРАЛЬ. Звыш праграмы ХРОНІКА

КІНО ПРАЛЕТАРЫ Пачатак з 2 гадз.

Гарольд Лёйд МАЛОДШЫ СЫН у 8 частках

Цэнтральны Камітэт Т-ва Чырвонага Крыжу БССР (Менск, Першамайская, 7)

ШУКАЕ наступных грамадзян, якім належыць спадчына пасьля памершых у Аўстрыцы родных:

Сабалеўскую Галену—маці Сабалеўскага Казімера.

Родных Крэйнмана Міхася

Копік (Копец, Копе) Васілісу і Тацяну—дочак Копік Алеся.

Зелязіна Левіка — брата Зелязіна Ісдара.

ЗЬБЕГЛА КАБЫЛА, цёмна-гнедая

Ведаючых просьба паведаміць па адрасу: Менск, Ун вэрсытэцкая вул., № 27, Комуна, тэл. № 8 53

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

ПАВЕДАМЛЯЕ,

што з 13-га сьнежня заняткі ў канторы і Менскім адзяленьні Дзяржбанку

БУДУЦЬ ПАЧЫНАЦЦА Ў 9 ГАДЗ. 30 ХВІЛ.

Прыём клентуры з 9 гадз. 30 хв. да 13 гадз. 30 хв.

АДМІНІСТРАЦЫЯ

1932 год ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА 1932 год

НА КРАЯЗНАЎЧЫ ЧАСОПІС

„САВЕЦКАЯ КРАІНА"

Орган Масавага Сэктару БАН і Цэнтральнага Бюро Краязнаўства

Умовы падпіскі: НА ГОД—4 руб., на 9 мес.—3 р. 25 к., на 6 мес.—2 р. 25 к., на 3 мес.—1 руб. 25 к., на 1 мес.—50 к.

Цана асобнага нумару 50 кап.

Падпіска прымаецца на пошце, у раённых кнігарнях, у раённых бюро краязнаўства.

РЭДАКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ

па барацьбе са школьнікамі ў сельскай і лясной гас-цы

АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ

на 5-ы прасьветны КУРСЫ на 40 асоб

тэхнікумаў пры Беларускае школе шкоўнікамі ў сельскай і лясной гаспадарцы

НА КУРСЫ ПРЫМАЮЦЦА асобы, маючыя адукацыю ў аб'ёме 7-мі-годкі і на ніжэйшай 6-мі-годкі, сяміклясці, ШКМ, саўгасвучу.

Патрэбны дакументы: 1. Аб месцы і часе нараджэньня, 2. Аб праве голасу, 3. Аб месцы і часе і 4. Аб здароўі.

Умовы вучобы: Усім — стипендыя 30 руб. і інтэрнат. Заявы падаваць у гор. Віцебск, Леніна Воля, д. № 2, тэхнікум „АБШ".

Аб пачатку заняткаў будзе дадаткова паведамлена кожнаму прынятаму

Бел. Аддз. „АБШ"

Арганізацыйная камісія па дэкадніку Камакадэміі даводзіць да ведама, што ДАКЛАДЫ КАМАКАДЭМІІ

ТРАНСЛЮЮЦЦА ПА РАДЫЁ

Трансляцыя пачынаецца а 7-й гадзіне, а таму Аргкамісія папярэджвае ўсіх т. т. маючых білеты, што даклады ПАЧЫНАЮЦЦА РОЎНА а 7-й гадзіне.

Пасьля пачатку дакладу ўваход у залю тых, хто спазьніўся, БУДЗЕ ЗАБАРОНЕНЫ.

Аргкамісія

МЕНГАРАНА З 1-га СТУДЗЕНЯ 1932 г.

АДКРЫВАЕ

8-МЕСЯЧНЫЯ НАСТАЎНІЦКІЯ КУРСЫ

Для падрыхтоўкі настаўнікаў 1 га канцэнтру ў ліку 120 асоб з сэкцыямі: беларуская, яўрэйская, польская.

На курсы будуць запрошаны асобы, якія маюць адукацыю на ніжэй 7-мігодкі. Асобы, якія маюць адпаведную падрыхтоўку, але ня маюць дакументаў могуць трымаць іспыты пры мясцовых аддзелах Наркамасьветы. Слухачы будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам (без пасьцельнай бялізны).

Заявы прымаюцца да 25-га сьнежня 1931 г. у Гарана, (Пляц Волі, будынак Гарсавету).

Да заяў неабходна падаць наступныя дакументы: а) пасьведчаньне аб адукацыі, б) аб сац. становішчы і паходжаньні, в) аб стане здароўя, г) аб адносінах да вайсковай павіннасьці.

Загадчык Гарана МАСЛАКОЎ

Гомельскае Аддзяленьне Цэнтраархіву БССР даводзіць да